

ПРА «ГЭТА» – ПАДЛЕТКАМ І БАЦЬКАМ

Сямейная газета



ГІСТОРЫЯ НЯБЕСНАЙ МАЛАДОЙ СЯМ'І

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 73 (28940)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У краіне неабходна павышаць якасць работы па прафілактыцы падлеткавай злачыннасці. У апошнія гады сітуацыя тут стабілізавалася. Па выніках першага квартала ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года адзначаецца зніжэнне на 2,6 працэнта злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі. Але, на жаль, у Мінскай і Гомельскай абласцях іх колькасць узрасла. Мы павінны прадметна працаваць з кожным непаўналетнім, каб гэтая статыстыка ўвесь час мела тэндэнцыю да зніжэння і якасць гэтай работы толькі ўзрастала».*

## КОРАТКА

- **Пасля пажару 15 красавіка Нотр-Дам дэ Пары будзе закрыты каля пяцішасці гадоў.**
- 1 млн дрэў планує пасадзіць ГА «Беларускі экалагічны рух» падчас акцыі «Дрэва пасаджана!».
- **BelToll з 10 чэрвеня да 10 ліпеня вызваліць ад платы за праезд па платных дарогах Беларусі ўладальнікаў ТС з дапушчальнай агульнай масай, не большай за 3,5 тоны з прычэпамі.**



- «Гомельшкло» будзе выраблять шматфункцыянальнае шкло з нанясеннем да 15 слаёў розных пакрыццяў без зніжэння празрыстасці.
- **У Гомелі затрымалі 21-гадовую мясцовую жыхарку, якая скрала ў сваёй бабулі $8,8 тыс.**

ISSN 1990 - 763X

# НА ЛЯСНОЙ ПРАЦЫ




Уладзімір ГУРСКІ (на фота справа) і Іван УРУБЛЕЎСКІ — землякі, аднавяскоўцы, нават суседзі. Жывуць яны ў вёсцы Ацмінава Навагрудскага раёна. Паколькі гэтая вёска — лясная, то і праца ў іх таксама звязана з лесам. Уладзімір і Іван шмат гадоў аддана служаць леснікамі, іхнія сцежкі-дарогі і ў лесе часта перасякаюцца.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Разумныя грошы

## КАБ НЕ ВАЗІЦЬ ГРОШЫ Ў ВАЛІЗЦЫ

### Як зберагчы ўласныя фінансы ў падарожжы

**Калі вы праспалі ранейшае браніраванне ў пачатку вясны, тады «пуцёўкі, якія гараць» — ваша ўсё. Толькі памятайце, што неад'емным аксесуарам вандроўкі сёння з'яўляецца плацежная картка, якая пазбавіць вас ад неабходнасці дэкларыраваць наяўныя пры перасячэнні мяжы і выключыць рызыку кішэнных крадзяжоў. Акрамя таго, апошнім часам стала модна мець пры сабе як мага менш наяўных. А многія нават робяць для паездак асобную картку.**

### Якую? Вось у чым пытанне

У прынцыпе, працаваць будзе любая пластыкавая міжнародная банкаўская карта, з дапамогай якой можна расплачвацца ў інтэрнэце і ў рэале. Яна вам патрэбна для браніравання білетаў і гатэляў, а таксама для аплаты ў крамах і зняцця наяўных. Такім чынам, вам падыдзе картка Visa і MasterCard любога банка, акрамя пластыку тыпу БЕЛКАРТ, якія служаць для выкарыстання толькі ў нашай краіне.

Але, калі вы падарожнічаеце не раз у дзесяць гадоў, то мае сэнс зрабіць імянную карту з чыпам, каб ужо напэўна працавала ўсюды. Вам за вочы хопіць Visa Classic / MasterCard Standart, вышэй ужо не трэба. Як варыянт, падыдуць і Visa Electron / Maestro, але часам па іх аплата не праходзіць у інтэрнэце.

СТАР. 4

Пасля «Вялікай размовы»

## КАШТОЎНАСЦІ ПАД ПАГРОЗАЙ

**На тэрыторыі Магілёўскай вобласці шмат цікавых архітэктурных помнікаў, якія маюць для Беларусі вялікую гістарычна-культурную каштоўнасць. На жаль, яны не ў самым лепшым стане і працягваюць разбурацца. Падчас правядзення акцыі «Задай пытанне Прэзідэнту» жыхар Магілёва Алег Дзьячкоў звярнуў увагу на касцёл дамініканцаў XVIII стагоддзя ў аграгарадку Княжыцы і старажытныя будынкі па вуліцы Лазарэнкі (былой Віленскай) у Магілёве.**

СТАР. 13



Фота Алега ДЗЬЯЧКОВА.

Княжыцкі касцёл просіць дапамогі.

Блізкая ўлада

# ДРОБНЫХ ПЫТАННЯЎ НЕ БЫВАЕ!

**Каля трыццаці чалавек запісаліся на асабісты прыём у Оршы да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі КАЧАНАВАЙ. Сярод заяўнікаў былі і жыхары іншых раёнаў Прыдзвінскага краю.**


Фота БелТА.

Першым выказаў просьбу аршанец, які нарадзіўся ў 1938 годзе. Пенсіянер папрасіў паспрыяць у выдзяленні фінансавай дапамогі. Калі гэта магчыма, улада пойдзе насустрач.

Аршанка прыйшла на прыём з сынам з абмежаванымі магчымасцямі. Спадзявалася на падтрымку ў працаўладкаванні хлопца, які ўжо два гады шукае працу, але пакуль безвынікова. Між іншым, у маладога чалавека адна са спецыяльнасцяў — сантэхнік. Але, улічваючы стан здароўя, працаваць можа далёка не на любым прадпрыемстве. Кіраўніцтву райвыканкама Наталля Качанава даручыла па працягу двух тыдняў станоўча вырашыць гэтае пытанне. І абавязкова пацікавіцца пасля, ці будзе зроблена ўсё магчымае.

Супрацоўнік аднаго з аршанскіх прадпрыемстваў расказаў, што працуе на ім 14 гадоў. Заўваг наконт дысцыпліны няма. Але ўзнік канфлікт з дырэктарам, у выніку пачуў пагрозы ў свой адрас, што могуць не працягнуць кантракт. Мужчына заверыў, што кіраўнік не карыстаецца павагай у многіх падначаленых і гэта ўплывае на атмасферу ў калектыве. Таму людзі звальняюцца. Кіраўнік Адміністрацыі паабяцала сустрэцца з калегамі заяўніка, каб ад іх пачуць, ці мае суразмоўнік рацыю. Завочна патрабавала ад кіраўнікоў паважаць падначаленых.

Сярод іншых агучылі пытанне вылучэння жылля інваліду першай групы з дзяцінства, які можа перасоўвацца толькі ў калясцы, кампенсацыі страты грамадзяніну па прысудзе.

Усе пытанні не застануцца без усебаковага і дэталёвага вывучэння і будуць разгледжаны без цяганіны і фармалізму.

Наталля Качанава, выслухаўшы чарговага заяўніка, падкрэсліла, што прыём незвычайны. Яна растлумачыла, што часцей за ўсё людзі агучваюць праблемы, звязаныя са сферай ЖКГ, а ў Оршы гутарылі на самыя розныя тэмы.

Каментуючы журналістам мерапрыемства, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла, што большасць зваротаў маглі б вырашыць на мясцовым узроўні. І ўважлівая праца з людскімі пытаннямі павінна быць паўсядзённай практыкай у дзейнасці адказных асоб. З боку заяўнікаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта не заўважыла негатыву. Гэта пацвярджае тое, што людзі адносяцца да ўлады ў цэлым з павагай. Але чакаюць разумення сваіх праблем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЗРАЗУМЕЦЬ СІТУАЦЫЮ, ДАПАМАГЧЫ ЧАЛАВЕКУ

**Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА правёў прыём грамадзян у Мінскім раёне.**

«Жыхары Мінскага раёна сталі радзей звяртацца па глабальных пытаннях, а больш — па асабістых. Сістэмныя праблемы, якія былі агучаны падчас мінулых прыёмаў, мы адсачылі, накіравалі фінансы, і гэта дало вынік. Напрыклад, мы выдзелілі больш сродкаў на раёны індывідуальнай забудовы і паспрабавалі прыцягнуць людзей, каб разам рабіць дарогі. Шчыльна працуем з медыцынай. На працягу месяца-двух плануем вырашыць пытанне з паркоўкай каля Мінскай раённай цэнтральнай бальніцы ў Бараўлянах. Акрамя таго, у гэтым годзе пачалі праектаванне часткі аб'екта аховы здароўя. Калі вырашым пытанне з грашыма, то ў наступным годзе плануем пачаць будаўніцтва чатырох бальніц і паліклінік у раёне», — адзначыў Анатоль Ісачанка. Яго словы прыводзіць карэспандэнт агенцтва БелТА.

Што да прыёму грамадзян, то ўчора да старшыні Мінаблвыканкама са сваімі пытаннямі і праблемамі прыйшлі дзесяць чалавек.

Жыхар Бараўлянаў папрасіў уладкаваць спартыўныя пляцоўкі і пешаходныя дарожкі каля яго жылога дома. Шматпавярховік быў уведзены ў эксплуатацыю ў 2010 годзе, работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі не выкананы да гэтага часу. Анатоль Ісачанка адказаў: «Давайце падымем дакументацыю: калі зона адказнасці наша, то зробім».

Жанчына з аграгарадка Новы Двор звярнулася адразу па некалькіх пытаннях. Па-першае, папрасіла забараніць продаж алкаголю на аб'екце грамадскага харчавання на прыпынку грамадскага транспарту каля школы. Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Таццяны Шаўцовай, кафэ правяралі — гандаль слабаалкагольнымі напоямі на гэтым аб'екце вядзецца па законе.

Яшчэ адно пытанне датычылася добраўпарадкавання вуліцы Маладзёжнай у аграгарадку Новы Двор. Генеральны дырэктар ДА «ЖКГ Мінскай вобласці» Васіль Шашок паабяцаў: да 30 красавіка работы будуць завершаны.

З нагоды якасці водаправоднай вады да губернатара звярнуўся жыхар пасёлка Юбілейны. Паводле яго слоў, вада цвёрдая і трубы гарачага водазабеспячэння забіваюцца налётам, даводзіцца перапайваць цэлыя стаякі. Старшыня Мінаблвыканкама даручыў спецыялістам у якасці эксперымента на паўгода паставіць у адным з дамоў сістэму памякчэння вады і потым далажыць яму аб выніках.

Заяўнік таксама папрасіў уладкаваць пешаходныя і веладарожкі вакол возера Сеніцкага. У сваю чаргу Анатоль Ісачанка прапанаваў вырашыць пытанне разам: улады ў гэтым годзе падрыхтуюць праектна-каштарысную дакументацыю, у наступным пачнуць будаўніцтва, але з умовай, што мясцовыя жыхары выйдуць на суботнік і дапамогуць з добраўпарадкаваннем.

На прыёме таксама ўздымаліся пытанні водазабеспячэння жылога дома, устанаўлення межаў зямельнага ўчастка, паляпшэння жыллёвых умоў шматдзетнай сям'і, адключэння электразабеспячэння.

У цэлым, адзначыў губернатар, складанасць прыёмаў грамадзян у тым, што часам цяжка ўлавіць, калі чалавек паступае меркантыльна, а ў якім выпадку яму сапраўды патрэбна дапамога. Вельмі складана разабрацца ў асабістых пытаннях. «Прыёмы грамадзян заўсёды цяжкія, калі іх праводзіць шчыра, спрабаваць зразумець сітуацыю, дапамагчы чалавеку», — сказаў Анатоль Ісачанка.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Parisien: Францыі можа не хапіць кваліфікаваных рабочых для рамонту Нотр-Дама

Францыя можа не мець дастаткова кваліфікаванай рабочай сілы для аднаўлення сабора Парыжскай Божай Маці пасля пажару. Пра гэта ў сераду паведаміла газета Le Parisien.

Паводле яе даных, для рамонтных работ спатрэбіцца вялікая колькасць страхароў, муляроў і цесляроў, а таксама майстроў па вырабе шкла, чырванадрэўшчыкаў і спецыялістаў па пазалоце. Як сказаў газеце адзін спецыяліст, «зараз нельга нават прыблізна вызначыць колькасць чалавек, неабходных для такіх работ». Эксперты падкрэсліваюць, што на рынку працы ў Францыі сёння вельмі мала неабходных спецыялістаў, бо такія прафесіі лічацца непрываблівымі сярод моладзі. Акрамя таго, адчуваецца і недахоп спецыялістаў, якія ведаюць спецыфіку працы на гістарычных аб'ектах.

### Вашынгтон і Варшава набліжаюцца да дамоўленасці аб стварэнні базы ЗША ў Польшчы

Адміністрацыя прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і ўлады Польшчы набліжаюцца да дамоўленасці ў кансультацыях, якія датычацца размяшчэння ваеннай базы ЗША на тэрыторыі краіны. Пра гэта паведаміла агенцтва Bloomberg.

Па словах яго крыніц, калі бакі прыйдуць да адзінага меркавання, прэзідэнт ЗША Дональд Трамп можа ўвосень гэтага года наведаць Польшчу. Як адзначаецца ў матэрыяле, раней планавалася, што прэм'ер-міністр Польшчы Матэўш Маравецкі ў найбліжэйшы час прыбудзе ў Вашынгтон для абмеркавання гэтага пытання з памочнікам амерыканскага лідара па нацыянальнай бяспецы Джонам Болтанам. Па звестках агенцтва, візіт Маравецкага ў амерыканскую сталіцу адкладзены, ён наведае пакуль Нью-Ёрк і Чыкага.

У публікацыі гаворыцца, што Вашынгтон і Варшава пакуль яшчэ не прыйшлі да адзінай думкі наконт таго, будзе ісці гаворка пра непасрэднае стварэнне ваеннага аб'екта ЗША ў краіне ці пра паступовае нарошчванне амерыканскай ваеннай прысутнасці ў Польшчы.

### Вучоныя прапанавалі ўзброіць МКС лазерам для барацьбы з касмічным смеццем



Навукоўцы з Інстытута прыкладной фізікі РАН прапануюць змясціць на Міжнароднай касмічнай станцыі арбітальны лазер для барацьбы з касмічным смеццем. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваных тэзісах даклада спецыялістаў ІПФ.

«У дакладзе разгледжаны варыянты схем арбітальнага лазера, які, будучы размешчаным на Міжнароднай касмічнай станцыі, можа стаць найбольш эфектыўным спосабам барацьбы з асабліва небяспечным касмічным смеццем. Гэтыя схемы грунтуюцца на выкарыстанні валаконных лазераў», — гаворыцца ў матэрыялах.

Па даных НАСА, на сённяшні дзень на арбіце знаходзіцца больш за 2200 дзеючых і больш за 5 тысяч касмічных апаратаў, якія ўжо адпрацавалі сваё, а таксама больш за 14 тысяч фрагментаў рознага касмічнага смецця. Усяго на арбіце Зямлі на гэты момант зафіксавана амаль 20 тысяч розных аб'ектаў. Многія з іх уяўляюць сур'ёзную небяспеку ў выпадку іх падзення на Зямлю.


Idea Bank®

Наименование банка:

**ЗАО «Идея Банк»**

www.ideabank.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2018 года**

ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 апреля 2019 | На 1 января 2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 35 787 | 43 684 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 36 525 | 53 778 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 27 885 | 19 942 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 298 851 | 285 313 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 27 850 | 28 408 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 7 468 | 7 437 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 49 | 88 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 18 216 | 20 028 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 452 636 | 458 683 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 14 081 | 17 650 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 340 741 | 335 478 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 7 941 | 4 120 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 4 218 | 3 284 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 366 981 | 360 532 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 40 000 | 40 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 7 523 | 7 523 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 10 512 | 10 634 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 27 620 | 39 994 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 85 655 | 98 151 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 452 636 | 458 683 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2019 года**

ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 апреля 2019 | На 1 апреля 2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 11 944 | 11 686 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 5 346 | 4 273 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 598 | 7 413 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 582 | 2 927 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 502 | 1 972 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 080 | 955 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | (3) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 291 | 2 751 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 186 | (997) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 817 | 769 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 8 050 | 9 709 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 744 | 654 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 806 | 2 519 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 625 | 837 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 181 | 1 682 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | - | - |

Председатель Правления Е.М. Папушева

Главный бухгалтер О.В. Глазырина

05 апреля 2019 года

Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года.
УНП 807000122



**ОАО «КОНДИТЕРСКАЯ ФАБРИКА «СЛОДЫЧ»**
**осуществляет реализацию следующей техники:**

**✓ ТРАКТОР МТЗ 82.1,**
1992 года выпуска, по цене 9 600,00 руб. без учета НДС.

**✓ АВТОМОБИЛЬ MAZDA 6,**
2004 года выпуска, по цене 6 760,00 руб. без учета НДС.

**Телефоны для справок:**
**8 (017) 398 97 37; + 375 29 355 20 67; + 375 29 121 0 441.**

**Место расположения объектов:**
**г. Минск, ул. Радиальная, 54/2.**

УНП 100129695

Тыдзень лесу

# ПАСАДЗІ СВАЁ ДРЭВА!

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дванаццаты раз далучыліся да рэспубліканскай акцыі і высадзілі лясныя культуры ў Лагойскім раёне.**

Лясны фонд Лагойскага лясгаса не ўпершыню папаўняецца лясными культурамі з дапамогай дэпутатаў і работнікаў сакратарыята Палаты прадстаўнікоў. Ужо многа гадоў запар падчас рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу» яны працуюць на лесасеках Задор'еўскага лясніцтва. Сёлета іх участак працы склаў 5,6 га тэрыторыі, было высаджана амаль 40 тысяч сеянцаў сасны і дзічак бярозы.



— Лясы — адзін з галоўных прыродных рэсурсаў Беларусі, — лічыць **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК.** — Таму вельмі важна не толькі захаваць яго, але і нарошчваць яго патэнцыял. Вядома, што ўласны рэсурс заўсёды больш выгадна выкарыстоўваць, таму ў эканоміцы створана шмат новых вытворчасцяў, якія выкарыстоўваюць драўніну. І для краіны вельмі важна своечасова аднаўляць і нарошчваць аб'ёмы пасадак лесу, каб на працягу максімальна вялікага перыяду часу можна было карыстацца гэтым рэсурсам. Акрамя таго, лясы — гэта «лёгкія Еўропы», якія дапамагаюць ствараць спрыяльныя ўмовы для жыхароў нашай краіны.

За час удзелу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у тыднях лесу было пасаджана больш за 56 га лесу, пры гэтым штогод плошча высаджаных імі культур павялічваецца.

Па словах **першага намесніка міністра лясной гаспадаркі Валянціна ШАТРАЎКІ,** які таксама разам з дэпутатамі прыняў удзел у акцыі, у гэтым годзе сіламі валанцёраў плануецца стварыць каля 4000 га лясных культур на больш як 2300 аб'ектах краіны, высадзіць каля 40 млн дрэў. Ужо на пачатку акцыі пра свой удзел у тыдні лесу заявілі каля 50 тыс. чалавек, але многія далучаюцца да пасадкі лесу без папярэдняй рэгістрацыі. Таму, магчыма, сёлета колькасць удзельнікаў дасягне ці перавысіць мінулагодні паказчык — больш за 80 тыс. чалавек.

— Па апошніх ацэнках лясістасць краіны складае 39,8 працэнта, — кажа Валянцін Шатраўка. — Пры гэтым у нас застаюцца рэзервы, якія таксама мы імкнёмся выкарыстаць. Згодна з Парыжскім пагадненнем па клімаце, якое Беларусь падпісала і ратыфікавала, плануем павялічваць лясістасць краіны — да 2030 года яна можа вырасці да 41 працэнта. Гэта можа адбыцца за кошт зямель, якія цяпер не выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы ці лічацца малапрадукцыйнымі, але з'яўляюцца прыдатнымі для вядзення лясной гаспадаркі, стварэння новых лясоў. Вынік гэтай працы залежыць ад супрацоўніцтва Мінлясгаса з сельгасарганізацыямі.

Усяго ж сёлета створана звыш 35 тыс. га лясных культур, у тым ліку на плошчах, якія былі ачышчаны ад усохлых насаджэнняў. Выкананню планаў паспрыяла добрае надвор'е, але праца будзе працягвацца і далей.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
**Фота аўтара.**

### Дарэчы

Падчас рэспубліканскага суботніка, які прысвечаны ў тым ліку 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў плануюць правесці акцыю ў Малым Трасцянцы — сустрэцца з ветэранамі, былымі вязнямі, ускласці кветкі ў памяць пра трагічныя падзеі і заладжыць фруктовы сад.

— Мы таксама запрасілі моладзь, каб перадаць ім эстафету добрых традыцый, — адзначыў Баляслаў Пірштук. — Нам вельмі хочацца, каб маладое пакаленне таксама далучылася да гэтай акцыі, таму што вельмі важна памятаць трагічныя і гераічныя старонкі нашай гісторыі, цаніць іх і, галоўнае, атрымліваць урокі.

## Сталічны ЧАС

• У Мінску 482,7 тыс. атрымальнікаў пенсій, з іх 175,2 тыс. працягваюць працаваць, паведамілі карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» ва ўпраўленні пенсій і дапамог камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Пры гэтым больш за 16,1 тыс. мінчан працягваюць працаваць ва ўзросце 70—79 гадоў, 926 — 80—89 гадоў, 13 — 90—99 гадоў. Сярэдні памер прызначаных пенсій усіх відаў у сталіцы на 1 лютага склаў 406,5 руб. (па краіне — 381,8 руб.). Сярэдні памер пенсіі па ўзросце — 413,2 руб. (па краіне — 393,5 руб.).

• Мінскім гарвыканкамам узгоднены графік выпрабаванняў і рамонту цеплавых магістраляў на міжацяпляльны сезон з мая да верасня (з прывязкай спіса спажыўцоў па адрасах), паведамілі БелТА ў РУП «Мінскэнерга». Графік прадугледжвае адключэнне 96 участкаў цеплавых сетак. Ён скарэктаваны з улікам правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў і прадугледжвае тэхнічны перапынак з 18 чэрвеня да 4 ліпеня. У сувязі з гэтым апошні этап адключэнняў будзе праходзіць у верасні. Падчас правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў у перыяд з 21 чэрвеня да 30 чэрвеня ў графіцы прадугледжаны тэхналагічны перапынак і ўсе спажыўцы будуць забяспечаны гарачым водазабеспячэннем. Працягласць адключэнняў не перавысіць 14 дзён, прычым тэрміны могуць быць скарочаны. Першы этап адключэнняў пачнецца з 13 мая.

## Затрыманы незвычайны злодзей-«гастралёр»

**У жыллё ён пранікаў асаблівым спосабам — прапальваў адтуліну ў створцы шклопакета, паведамілі ва УУС Мінаблвыканкама. Такіх выпадкаў на тэрыторыі Беларусі раней не было.**

Першае паведамленне аб крадзяжы, які здзейсніў меркаваны зламыснік, паступіла 1 лістапада мінулага года. Жыхар Заслаўя растлумачыў, што невядомы, ночку ўскрыўшы шклопакет, пранік у жыллё і выкраў 1500 рублёў, тры гадзіннікі, а таксама ювелірныя вырабы на суму больш за 5000 рублёў. На запісе відэаназірання было відаць, што злачынства здзейсніў адзін чалавек. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага РУУС звярнулі ўвагу на асаблівы спосаб пранікнення ў жыллё — шляхам прапальвання адтуліны ў створцы шклопакета.

Другі падобны выпадак адбыўся ў Калодзішчах. 12 лістапада зноў жа мінулага года ў аператыўнадзяжурную службу звярнулася мясцовая жыхарка. Яна каля чатырох гадзін раніцы пачула крокі ў доме, а падняўшыся паглядзець, у чым справа, убачыла сілуэт мужчыны, што вылазіў у акно. У доме нічога не было скрадзена, аднак спосаб пранікнення ў жыллё быў аналагічным з выпадкам у Заслаўі. Наступны такі выпадак пранікнення ў жыллё адбыўся ў Тарасаве, а апошні аналагічны факт — у Ратамцы.

Пры адпрацоўцы аднаго з садовых таварыстваў на тэрыторыі Мінскага раёна на адным з дачных участкаў былі заўважаны сляды пражывання. Калі аператыўнікі падыходзілі да дома, каб даведацца, хто там жыве, з жылля выскачыў мужчына і кінуўся ў бок лесу. Аператыўнікі затрымалі ўцекача.

У ходзе вобыску ў мужчыны была выяўлена маёмасць, якая яму не належала, а таксама прыстасаванні, якія маглі быць выкарыстаны для прапальвання і ўскрыцця шклопакетаў, а таксама гадзіннікі, аналагічныя выкрадзеным у Заслаўі. Была ўстаноўлена датычнасць затрыманага да названых вышэй і іншых дачных крадзяжоў, усяго больш за дзесяць злачынстваў. Што ж датычыцца асобы злачынца, ім аказаўся 53-гадовы ўраджэнец Данецкай вобласці, які раней меў судзімасць на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі за здзяйсненне кватэрных крадзяжоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Негалантны кавалер

**Аператыўнікі затрымалі 41-гадовага грамадзяніна Германіі, які абакраў жанчыну пасля праведзенага разам з ёй вечара, паведамілі БелТА ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

30-гадовая жыхарка Мінскага раёна звярнулася ў міліцыю. Яна расказала, што пасля знаёмства з жыхаром Германіі ў яе прапалі інкруставаны дыяментамі залаты крыжык і залаты ланцужок на агульную суму звыш Br7 тысяч. Высветлілася, што ўвечары 13 красавіка жанчына ў сталічным клубе пазнаёмілася з 41-гадовым мужчынам. Пазней пара адправілася ў гатэль да замежніка. «Правёўшы ў гасцях некаторы час, жанчына вырашыла паехаць дадому. Назаўтра яна выявіла згубу залатога крыжыка і залатога ланцужка. Пасля таго як яна вярнулася ў гатэль і даведалася, што мужчына ўжо з'ехаў, а ў нумары ўпрыгажэнняў не знайшлося, яна звярнулася ў міліцыю, — расказалі ў ГУУС. — Аператыўнікі затрымалі мужчыну, грамадзяніна Германіі афганскага паходжання 15 красавіка ў Гомелі, ён ехаў да мяжы з тымі самымі каштоўнасцямі». Мужчына знаходзіцца ў ізалятары, у дачыненні да яго заведзена крымінальная справа.

Сенсацыя?!

# «ПІСЬМЕННІК, УЛЮБЁНЕЦ БОГА»

## Ва Украіне знойдзена надмагільная пліта Яна Баршчэўскага?

**Гэтую навіну можна аднесці да ліку сенсацый у сферы айчыннай культуры. Як паведамляюць украінскія медыя, днямі знойдзена надмагільная пліта класіка беларускай літаратуры Яна Баршчэўскага, аўтара культавага твора «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Вядома, што памёр пісьменнік у Чуднаве (сучасная Житомірская вобласць), але яго надмагільная пліта літаральна днямі была знойдзена на адным з мясцовых падворкаў.**

Гісторыя знаходкі пачалася даўно. Жыхар Чуднава, праводзячы газаправод да свайго дома, 17 гадоў таму выкапаў старую чыгунную пліту. Яна знаходзілася ў зямлі на глыбіні 50 сантыметраў. Пліта была досыць цяжкай — важыла 30—35 кілаграмаў. Было відаць, што на ёй змешчаны пэўны надпіс, аднак прачытаць яго было немагчыма з-за ржы. Дзесяць гадоў пліта проста стаяла пад хлевам. Але неўзабаве гаспадар вырашыў зацэментаваць падворак — і для эканоміі матэрыялу на кавалак участка паклаў пліту.




З часам пад уплывам надвор'я ржа з пліты сцёрлася і стаў выразна відаць надпіс. Гаспадары лічылі, што ён зроблены на нямецкай мове, таму асабліва не пераймаліся зместам. Аж пакуль 15 красавіка пераклад не зацікавіў іх дачку Алену.

Дзяўчынка старанна перапісала прозвішча і імя, з якіх пачынаўся надпіс на пліце. Увёўшы іх у пошукавік у інтэрнэце, яна адразу атрымала шмат спасылак на вядомага беларускага пісьменніка Яна Баршчэўскага, які жыў і памёр у Чуднаве ў 1851 годзе. Цалкам магчыма, што чыгунная пліта акурат з'яўляецца надмагільнай плітой вядомага творцы.

Цалкам надпіс з польскай перакладаецца прыблізна так: «Ян Баршчэўскі, які любіў Бога, прыроду і людзей. Пісьменнік з натхнення і пачуцця. Дабрадзейна жыў гадоў 70. Памёр 28 лютага 1851 года».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Напярэдадні падзеі

# Балтыйская ліга — у Мінску

**У гэтыя выхадныя, 20—21 красавіка, Палац спорту «Уручча» прыме «фінал чатырох» Балтыйскай лігі. У першы дзень адбудуцца паўфіналы, літоўскі гандбольны клуб «Драгунас» сустрэнецца з украінскім ЗТР, а мінскі СКА згуляе з цяперашнім уладальнікам трафея фінскім «Рыіхімякі». У другі дзень пройдуць матчы за 3-е і 1-е месцы.**

*«Мы прыязджалі ў Мінск, каб вывучыць мясцовыя ўмовы, і засталіся вельмі задаволеныя ўбачаным,* — расказвае **менеджар Балтыйскай лігі Урмо СІТСІ.** — *На правядзенне «фіналу чатырох» таксама прэтэндавала Клайпеда, але ў Мінска аказаліся відавочныя перавагі. Выдатны, нядаўна пабудаваны Палац спорту, разлічаны на тры тысячы гледачоў, сучасная інфраструктура для ўсіх — камандаў, суддзяў, тэлебачання і гледачоў. Мы сталі сведкамі мясцовага дэрбі СКА — БГК імя Мяшкова. Атмасфера на гэтай сустрэчы была цудоўнай. Амаль дзве тысячы балельшчыкаў падтрымлівалі каманды, для гледачоў клуб арганізаваў шмат забаў перад матчам і ў перапынку. Арганізацыя паядынку была на высокім узроўні, так што рашэнне аб правядзенні «фіналу чатырох» менавіта ў Мінску аказалася для нас простым».*

Адзначым, гандбалісты мінскага СКА тройчы выйгравалі Балтыйскую лігу (2013, 2014, 2015), адзін раз былі ўладальнікамі «серабра» (2016) і двойчы — «бронзы» (2017, 2018). У мінулым сезоне мінчане ў матчы за 3-е месца абыгралі ЗТР з лікам 40:37, а ў вырашальным паядынку за «залата» «Рыіхімякі» нанёс паражэнне эстонскай «Пыльве» — 26:23.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# КАБ НЕ ВАЗІЦЬ ГРОШЫ Ў ВАЛІЗЦЫ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Пачатак на 1-й стар.

Акрамя тарыфаў, ёсць яшчэ такі момант, як зручнасць карыстання, якая залежыць ад тэхпадтрымкі банка і функцыянальнасці інтэрнэт-банка, бо нейкія пытанні прыйдзецца вырашаць на адлегласці.

## У якой валюце адкрываць рахунак для карты?

Самы лагічны адказ — у той валюце, у якой у вас прыбытак. Вы ж атрымліваеце грошы ў рублях, то і рахунак павінен быць рублёвы. Так, калі едзеце, напрыклад, у Еўропу, то пры зняцці наяўных у банкамаце ці аплаце пакупак у краме аўтаматычна будзе адбывацца канвертацыя ў еўра. Таму ці варта з-за кароткіх падарожжаў заводзіць рахунак адразу ў еўра, вырашаць вам. Тут трэба разумець, што курсы валют пастаянна мяняюцца, таму ў ідэале трэба класці на валютныя карткі долары ці еўра, набытыя па добрым курсе. У ідэале мець некальκі картаў у розных валютах (рублі, долары, еўра) і карыстацца імі ў залежнасці ад сітуацыі. Трэба разумець, што калі сапраўды хочацца выгады, то прыйдзецца разабрацца з курсамі і тарыфамі.

## Што выбраць — MasterCard або Visa?

На жаль, адназначна сказаць нельга, што лепш. Вам прыйдзецца даведвацца ў свайго банка, праз якую валюту ён працуе з плацежнай сістэмай (гэта значыць праз долары ці еўра будзе ісці канвертацыя пры аплаце ў іншай валюце), якая камісія за трансгранічны плацеж і якая камісія за зняцце наяўных у банкамаце іншага банка. І тут трэба глядзець, ці адрозніваюцца тарыфы банка для розных плацежных сістэм. У цэлым усё зводзіцца да выбару банка, а не плацежнай сістэмы.

Схема ж — калі Еўропа, то Mastercard, калі Амерыка, то Visa — некарэктная. Аднойчы хтосьці пусціў у сеціве гэты міф, і ўсе яго растыражавалі.

Таксама пры паездцы ў экзатычныя краіны мае сэнс даведацца, ці прымаецца там адпаведная плацежная сістэма. Чытаў, што на Кубе і ў Афрыцы ёсць праблемы з Visa. На цяперашні момант, некаторымі экспертамі было заўважана, што пры іншых роўных больш выгадна заказваць карты Mastercard, бо па іх часта адсутнічае камісія за трансгран. У той час як па Visa яна часцей ёсць. Але гэта не ісціна, таму трэба глядзець канкрэтны банк і яго тарыфы.

## ІБ у падарожжы

Магчыма, інтэрнэт-банк (ІБ) і не спатрэбіцца вам, калі вы не актыўны карыстальнік картак і рахункаў і рэдка нешта робіце з імі, але лепш каб ён быў. Можа ўзнікнуць неабходнасць перакінуць грошы з адной карты на іншую або пагледзець выпіску па апошніх аперацыях (аплата гатэляў, пакупкі ў крамах і кафэ). Таксама, як правіла, праз інтэрнэт-банк можна звязацца з тэхпадтрымкай, заблакаваць карту, аплаціць тэлефон або ўнесці кватэрплату ў сябе на Радзіме. Увогуле, у падарожжы ІБ — гэта вельмі карысная штука. А калі ехаць кудысьці надоўга, то я наогул не ўяўляю, як можна без інтэрнэт-банка абысціся.

Таксама ёсць яшчэ мабільны банк, праграма, якая на тэлефон усталёўваецца. У ім альбо такі паўнавартасны функцыянал, альбо зрэзаны. Таксама карысная рэч, але пажадана толькі свой смартфон не губляць. І, вядома ж, каб мабільны інтэрнэт прысутнічаў.

## «Пластыку» шмат не бывае

Лепш, калі будзе некалькі картак і ад розных банкаў. Напрыклад, адна асноўная для пакупак у крамах, другая для аплаты ў інтэрнэце, трэцяя для зняцця наяўных. Тады можна падгадваць вельмі добрыя тарыфы па кожным з гэтых варыянтаў.

Напрыклад, раптам адну картку банк заблакуе (такое бывае) або яе згубіце, тады можна будзе хуценька зайсці ў інтэрнэт-банк і перакінуць сродкі на іншую. Ці па адной з картак аплата праходзіць не будзе. Менавіта таму ў мяне іх некалькі. Яшчэ часам бывае зручна рабіць дадатковыя да асноўнай карткі для сваякоў. Рахунак адзін, а ў кожнага па сваёй асабістай карткі.

## Бяспека

Памятайце: не трымайце на картцы шмат грошай. Хай асноўныя сродкі знаходзяцца на ўкладах, сейф-рахунках, бездакументарных аблігацыях — на крайняк. Бо, выкарыстоўваючы свой «пластык», вы свеціце яго даныя і рызыкуеце. На жаль, ашуканцы не дрэмлюць, ставяць счытвальныя прылады на банкаматы (скімеры), крадуць даныя картак у інтэрнэце і іншае. Таму на асноўных картках нельга захоўваць значныя грошы. У інтэрнэт-банку вызначце ліміты на сутачныя і месячныя аперацыі.

## Авіябілеты аплачвайце карткай, якая ў руках

Віртуальныя карткі фізічна не існуюць. Але яны ўжо ёсць. Патрэбныя яны для памяншэння рызыкі пры плацяжах праз інтэрнэт. Дапусцім, вы хочаце купіць нешта за 1000 рублёў. Выпускаеце віртуальную карту ў сябе ў інтэрнэт-банку з сумай у 1000 рублёў на рахунку і лімітам часу для выкарыстання. Потым аплачваеце куплю — і ўсё, картка сваё адпрацавала. Гэта значыць, калі раптам плацежныя даныя гэтай карткі патрапяць у рукі зламыснікаў, то яны ўжо нічога не змогуць зрабіць, бо яе ўжо няма.

Калі ж даныя патрапяць да таго, як вы патрацілі грошы, то яны не змогуць зняць больш, чым на ёй ёсць цяпер. З іншага боку, прасунутыя банкі даюць магчымасць вызначаць ліміты на аперацыі. Напрыклад, можна выставіць 0 рублёў і толькі перад купляй змяніць суму да патрэбнай мяжы. Такой схемай некаторыя карыстаюцца для пакупак праз інтэрнэт у Азіі, бо яна з'яўляецца адным з самых рызыкоўных рэгіёнаў.

Толькі лепш не купляць авіябілеты па віртуальнай картцы. Пры пасадцы на рэйс вас могуць папрасіць прад'явіць гэты «пластык», што вы зрабіць не зможаце, раз картка віртуальная. Уласна, гэта і звычайнага «пластыку», пакінутага дома, датычыцца. Так што лепш аплачваць авіябілеты той карткай, якая будзе з вамі ў падарожжы.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**Извещение о проведении 17 мая 2019 года повторных торгов с условиями по продаже изолированных помещений, принадлежащих ОАО «Стройтрест № 35»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-798190611, общей площадью 84,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-260 | 188 160,00 | 18 800,00 |
| 2 | Помещение образовательного, воспитательного и научного назначения с инвентарным номером 500/D-798190612, общей площадью 148,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 9-261 | 264 600,00 | 26 400,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Стройтрест № 35», ул. Я. Коласа, 38, 220013, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Стройтрест № 35», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **17 мая 2019 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **18.04.2019 по 15.05.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 611-50-44.

**Телефоны для справок:**

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 611-50-44 (ОАО «Стройтрест № 35»).



**АБСОЛЮТБАНК**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2019 г.**

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 589 | 12 678 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 4 187 | 3 976 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 59 049 | 41 816 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 21 883 | 6 337 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 15 538 | 21 932 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 11 | 11 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6 967 | 7 111 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 151 | 151 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 450 | 2 367 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 7 | 7 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 2 218 | 2 377 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | **121 050** | **98 763** |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 6 | 12 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 59 490 | 36 784 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 2 650 | 4 336 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 900 | 788 |
| 24 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **63 046** | **41 920** |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 39 331 | 39 331 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 2 783 | 2 651 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 3 366 | 3 366 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 524 | 11 495 |
| 31 | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **58 004** | **56 843** |
| 32 | **ИТОГО обязательства и собственныйкапитал** | **12** | **121 050** | **98 763** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2019 г.**

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» *(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.04.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1 515 | 2 168 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 114 | 396 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 401 | 1 772 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 225 | 247 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 140 | 179 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 85 | 68 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 33 | 158 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 065 | 1 268 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (317) | 445 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 754 | 229 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 3 302 | 2 449 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 23 | 18 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 330 | 583 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 169 | 160 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **1 161** | **423** |

Руководитель В.И. Вашкевич

Главный бухгалтер О.С. Турбина

Дата подписания: 08 апреля 2019 г.

**Отчетность о деятельности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» в полном объеме размещена на сайте www. absolutbank.by.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 9 от 06.09.2017. УНП 100331707



Утерянные страховые полисы карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY/07/15194695, 14148241, 14148242 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

УНП 100357923

# БЕЗ ПРАВА НА ПРЫВАТНАСЦЬ?

У бацькоўскіх суполках абмяркоўваюць: адна сталічная мама змясціла на YouTube відэаролік уласных родаў. Не, нічога «такога»: на кадрах, знятых яе мужам, толькі перадродавы этап і немаўля ў пялюшках. Але ўласна наконт немаўляці і разгарэліся спрэчкі — навошта, дзеля чаго мама гэта зрабіла? Паказаць, што яна таксама ўмее нараджаць? Пахваліцца здаровым дзіцем? Цікава, ці будзе яно праз некалькі гадоў удзячнае бацькам за тую «хвіліну славы»...

Дарэчы, вы ведаеце, што такое «шэрэнтынг»? А вось яно самае: спалучэнне слоў «share» — дзяліцца, і «parenting» — выхаванне (дзяцей), неўтаймоўнае жаданне бацькоў выкладваць у сацыяльныя сеткі фота сваіх дзяцей і дзяліцца гісторыямі з іх жыцця.

Многія лічаць, што ніякай праблемы тут няма: звычайнае і натуральнае жаданне бацькоў пахваліцца тым, якія прыгожыя, разумныя, таленавітыя (патрэбнае падкрэсліць) у іх дзеці. Маўляў, нашы фотаздымкі бацькі таксама паказвалі ў альбомах сябрам — і нічога, маральнай траўмы нам гэта не нанесла. Усё так, але, паклаўшы руку на сэрца, колькі чалавек маглі ўбачыць гэты альбом? Дзесяць, ну, дваццаць — сваякі, блізкія, але ніяк не выпадковыя людзі. А ўжо наконт немаўляці даўней існавала вельмі жорсткая сістэма рэгламентацый, прадпісанняў і абмежаванняў: як хрысціць, каму і што паказваць і расказваць...

Безумоўна, час змяніўся. Цяперашнія дзеці — самае фатаграфуемае пакаленне з усіх папярэдніх, і, як падлічылі сацыёлагі, звыш 80 % малых ва ўзросце да 2 гадоў паспелі «адзначыцца» ў сацыяльных сетках дзякуючы бацькам. Але гэта далёка не заўжды выклікае замілаванне як у іншых карыстальнікаў сеціва, так і ў саміх дзяцей. Вас гэта здзіўляе? Чаму?

Блог-платформа Livejournal бярэ адлік з 1999-га, стваральнік Facebook Марк Цукерберг заснаваў праект у 2004-м, сацыяльныя сеткі «Аднакласнікі» і «УКантакце» пачалі работу ў 2006 годзе. Атрымліваецца, аднагодкам сацсетак — не менш за 13—15 гадоў. Пры гэтым, паводле правілаў многіх платформаў, самі падлеткі не могуць заводзіць акаўнты ў іх да дасягнення ўзросту 13 гадоў, — а значыць, далёка не заўсёды ведаюць, што мы там пра іх расказваем і паказваем. Але гэта не азначае, што ў нашых дзяцей няма права на абарону асабістага жыцця. Так, фота дзіцяці з соскай і на гаршку, змешчанае ў вашым профілі, праз некалькі гадоў могуць знайсці яго настаўнікі, аднакласнікі, дзеці вашых сяброў — і не факт, што пасля гэтага дзіця не пачнуць дражніць альбо яно само не адчуе комплексы ад няўдалага ракурсу ці крыўдных каментарыяў. Хіба вам спадабалася б, калі б ваш самы няўдалы і недарэчны здымак з дзяцінства ўбачылі ваш муж/жонка, калегі, кіраўнік, суседзі?..

Не факт, што размешчанае ў свабодным доступе фота не будзе скарыстанае як ілюстрацыя — скажам, да матэрыялу пра сямейны гвалт або ў камерцыйных мэтах — напрыклад, як рэклама сродку... ад запору. Не факт, што хтосьці зусім незнаёмы не пазнае на фота ваш дом, школу або дзіцячы садок...

Канешне, тут варта не перагінаць палку і не ствараць праблем на пустым месцы. Але ўсё ж — успомніце, калі ласка, што бацькоўства не дае вам выключнага права распараджацца асабістай прасторай дзіцяці. Проста пастаўцеся да гэтага больш сур'ёзна: як мінімум абмяркуйце публікацыю асабістых момантаў і ўключыце настройкі прыватнасці.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сямейная газета

Выпуск № 7 (122)

Нельга забыць

# ПЯРЛОЎКА ДА БЕРЛІНА ДАВЯЛА

## Чым кармілі чырвонаармейцаў на фронце і ці было месца каханню пад бамбёжкамі



Фота БелТА.

Ганна і Васіль у першыя гады сумеснага жыцця...

**Разам з карэспандэнтам «Звязды» ветэран Вялікай Айчыннай вайны франтавы повар Ганна ВОРАНАВА ўспомніла пра самыя шчаслівыя і самыя горкія моманты жыцця.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Тонкая матэрыя

# Калі свет становіцца чужым

## У чым небяспека дзіцячай траўмы ад здрады бацькоў



**За мінулы год 26 усыноўленых дзяцей паўторна сталі сіротамі. Аднойчы яны ўжо засталіся без самых блізкіх на зямлі — сваіх родных бацькоў. Але раптам з'явілася надзея. Іх знайшлі іншыя людзі, якія прынялі рашэнне: дапамагчы маленькім чалавечкам перажыць іх вялікую трагедыю. Яны прытулілі малых да сябе і паабяцалі быць іх новымі бацькамі. І вось зноў — падман, зноў нікому не патрэбныя...**

**Чаму так адбываецца і як уплывае на жыццё дзяцей такая здрада, расказваюць спецыялісты Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.**

— Ёсць некалькі прычын, чаму здараюцца адмены ўсынаўлення, — тлумачыць **Вольга ГЛІНСКАЯ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення** *(на фота)*. — Гэта смерць усынавіцеляў, развод — калі раптам дзіця ўжо непатрэбнае, нейкія ўнутрысямейныя канфлікты, напрыклад, у бацькоў, дзе побач з усыноўленымі выхоўваюцца біялагічныя дзеці. Ёсць і выпадкі, калі людзі ўвогуле аказаліся не гатовы да бацькоўства.

Дарэчы, адмена ўсынаўлення адбылася ў дачыненні да дзяцей, якіх усынавілі ў 2011—2015 гадах, — на гэты перыяд прыйшоўся пік усынаўлення ў краіне. Падчас тых кампаній па ўладкаванні дзяцей у сем'і ў год усынаўлялі амаль па 580 дзяцей.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# Калі свет становіцца чужым



### У ЧЫМ НЕБЯСПЕКА

Страта бацькоў лічыцца адной з самых цяжкіх траўмаў. Дзеці, у якіх псіхіка больш-менш моцная і здароўе дазваляе, пры ўмелым падыходзе прыёмных бацькоў могуць перажыць першую траўму. Але аднаўленне псіхікі праходзіць значна больш цяжка, калі траўму страты дзіця атрымлівае паўторна.

— Уявіце сабе, што вы зламалі руку, — гаворыць **Надзея ЧЫРКОВА, педагог-псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.** — Працэс аднаўлення магчымы. Прайшоў час, рука зажыла, вы прайшлі курс рэабілітацыі. І тут раз — на тым жа месцы рука зноў зламалася. Вынік — зажыўленне будзе праходзіць цяжка, і на гэта спатрэбіцца больш часу. З псіхікай працэсы «зажыўлення» яшчэ больш складаныя.



Аднаўленне даверу да людзей, жыцця і свету ў дзяцей праходзіць паступова і даволі павольна пасля атрымання першай траўмы. Калі ж здрадніцтва паўтараецца — наступствы могуць быць вельмі трагічныя. Пры такім развіцці падзей першая і галоўная небяспека — гэта павышэнне схільнасці да суіцыду.

— Самай складанай лічыцца сітуацыя, калі бацькі вырашаюцца на адмову падчас уваходжання дзіцяці ў падлеткавы ўзрост, — расказвае Надзея Чыркова. — Гэты перыяд цяжка пераадольваюць маладыя людзі нават з паспяховых сем'яў, дзе ўважлівыя і клапатлівыя бацькі. Падчас пераходнага ўзросту адбываецца гарманальная, фізічная і псіхалагічная перабудова, калі моладзь сумняваюцца ва ўсім. А тут да гэтага дадаецца здрада блізкіх, якія некалькі гадоў запар даказвалі, што ім можна давяраць, што свет — не варожы... У такой сітуацыі не кожны здаровы зможа выстаяць, не тое, што траўмаванае дзіця.

Яшчэ адна небяспека такіх падзей у жыцці сірот — з'яўленне ў іх дэвіянтных паводзін. А гэта азначае схільнасць да рознага роду залежнасцяў, напрыклад, алкагольнай ці наркатычнай, да бадзяжніцтва, да здзяйснення розных злачынстваў.

— Але самае крыўднае, што дзіця сыходзіць у соцыум без веры ў сям'ю, без яе падтрымкі, — дадае спецыяліст. — У такіх людзей быццам бы няма ўнутранай асновы, фундамента... Яны часта становяцца ахвярамі педафілаў і злачынцаў, якія знішчаюць ці падаўляюць іх унутраную асобу.

### ПРА ДАВЕР І НЕДАВЕР

Каб зразумець, што адбываецца з дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, трэба ведаць сутнасць тэорыі прыхільнасці. Прыхільнасць — гэта такая нябачная нітка, якая звязвае маці і дзіця.

— Сувязь паміж маці і дзіцем вельмі моцная, — тлумачыць **Наталля ГЕНЦАЛЕВА, педагог-псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.** — Малое цалкам залежыць ад маці, якая ў ідэале задавальняе фізічныя, псіхалагічныя і эмацыянальныя патрэбы дзіцяці.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Прыхільнасць з'яўляецца з пачаткам фарміравання плода. І першы крызіс узнікае ў нованароджанага, калі ён пакідае звыклае асяроддзе, у якім знаходзіўся. Немаўля пачынае самастойна дыхаць кіслародам, яму трэба па-іншаму харчавацца, яно можа адчуваць холад, голад, дыскамфорт. Усё не так, як ва ўлонні маці. І гэта стрэс. Пачуццё бяспекі вельмі важнае для чалавека, і яно адыгрывае вырашальную ролю ў фарміраванні даверу да жыцця. Давер фарміруецца ў маці на руках. Калі бяспека існуе ў адносінах паміж мамай і дзіцем, то яна фарміруе базавы давер да дарослых. Адразу — гэта бацькі, потым — блізкае асяроддзе.

— Гэта незвычайнае развіццё даверу да свету можна ўбачыць і збоку, — гаворыць спецыяліст. — Спачатку немаўля жыве быццам бы на руках у маці, потым на каленях, потым — гуляе поруч, і толькі пасля ўсё больш смялее і тады аддаляецца ад маці. Давер пачынаецца з матчыных рук і развіваецца павольна, раўнамернымі і невялікімі крокамі. Калі дзіця пачынае наведваць садок, межы яго даверу ўсё больш пашыраюцца, як і ў школе. Калі ўсё адбываецца так, як трэба, чалавек адчувае сябе ўпэўненым і ўмее дасягаць сваіх мэт. Чым больш даверу — тым вышэй мэты. Такая асоба не баіцца жыць, адчувае ўнутраную апору, якую дала яшчэ тая дзіцячая прыхільнасць.

У дзіцяці з неўладкаванай сям'і дэфармацыя прыхільнасці адбываецца ўжо на пачатковых этапах. Маці несвоечасова задавальняе патрэбы немаўляці. Давер да свету парушаны, дзіця не адчувае сябе ў бяспецы.

— Мы забіраем маленькага чалавека ўжо з парушанай прыхільнасцю і змяшчаем у іншую сям'ю, — расказвае Наталля Генцалева. — Новыя бацькі паступова даказваюць малому, што свет не такі дрэнны і ў ім можна існаваць, што дарослым можна давяраць, а ён, хоць і малы, але вельмі важны чалавечак на гэтым свеце. Але...

Калі маці-ўсынавіцель ускладае на сябе гэту ролю, яна вельмі стамляецца. Быць усынавіцелем — гэта вельмі затратная эмацыянальная роля. Адаптацыя дзіцяці ў новай сям'і і новая прыхільнасць фарміруецца на працягу з года да пяці гадоў. За гэты час, калі ўсынавіцелі не будуць клапаціцца аб сабе і аб сваім эмацыянальным стане, то проста выгараць. Ужо і дзіця, здаецца, пачынае давяраць сваім дарослым, а маці ўжо нічога не можа і не хоча, бо перагарэла. У такім стане яна падае заяву на адмену ўсынаўлення. У выніку старая траўма малога абвастраецца, дзіця ўпэўніваецца, што дарослым давяраць нельга. Увесь свет для яго становіцца варожы. І не важна, у якім узросце малое атрымала паўторную траўму — усе яе былыя сімптомы ўспыхнуць з новай, больш разбуральнай сілай.

— Калі прыхільнасць парушана, то новую сфарміраваць вельмі складана, — тлумачыць спецыяліст. — Але! Асоба чалавека шматгранная, мозг — вельмі разумны, і ён часта дапамагае ў такіх сітуацыях. Напрыклад, уключае механізм выцяснення, калі ўспаміны занадта траўматычныя. Ёсць дзеці, якія перажывалі і па чатыры здрады з боку дарослых, але ім усё роўна ўдалося адаптавацца, атрымаць годную адукацыю і стварыць сям'ю.

### ЦІ МОЖНА ГЭТА ПРАДУХІЛІЦЬ?

Жанчына марыла аб дзіцяці. Яна нарадзілася ў шматдзетнай сям'і і таму для яе было натуральным і важным рэалізаваць сябе як маці. Ужо будучы замужам, яна даведалася, што не можа мець дзяцей. З мужам прайшлі ўсё: і складанае лячэнне, і няўдалыя спробы ЭКА. Вырашылі ўдачарыць дзяўчынку. І вось, калі, здаецца, мара здзейснілася, нешта пайшло не так. Усё, што да гэтага ўяўляла сабе жанчына: жыццё з дзіцем, блізкія адносіны з мужам, — аказалася ілюзіяй. Даглядаць малое было вельмі складана, муж не дапамагаў, часта з'язджаў у працяглыя камандзіроўкі. Жанчына адчувала сябе прывязанай да гэтай дзяўчынкі. Родныя не разумелі яе пакут і стомленасці. У выніку, калі муж вяртаўся дадому, яна зрывалася. У хуткім часе муж сышоў. Жанчына стала патроху выпіваць. Яна не мела зносін з іншымі ўсынавіцелямі, якія маглі б яе падтрымаць, і не звярнулася да спецыялістаў па дапамогу. Калі ж даведалася, што яе былы муж ажаніўся і ў яго нарадзілася дзіця, то больш не стрымлівала сябе. На адмену ўсынаўлення падалі дакументы органы апекі. Жанчыну пазбавілі бацькоўскіх правоў.

— Канешне, мы праводзім падрыхтоўчую работу з будучымі бацькамі, — гаворыць **Аляксандр МАЛАШУК, педагог-псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.** — Тэсціруем усынавіцеляў і можам убачыць іх рэсурсы, праблемы ці крызісы, якія ёсць у сям'і, але толькі на момант тэсціравання. Мы можам ацаніць іх кампетэнцыі, здольнасць кантраляваць сябе і разумець свае патрэбы. Аднак гэта ніколі не дасць гарантыі, што адмена ўсынаўлення не здарыцца. Мы кансультуем будучых бацькоў, расказваем, дзе ў іх ёсць рызыка, зыходзячы з асаблівасцяў іх тэмпераменту. Нават можам парэкамендаваць узрост дзіцяці. Працуем на апярэджанне: расказваем, якія іх могуць чакаць складанасці, як выглядаюць першыя прыкметы выгарання, вучым іх быць больш адкрытымі, каб яны не баяліся звяртацца па дапамогу. Аднак часта для ўсынавіцеляў звярнуцца да спецыялістаў — значыць прызнаць, што яны не справіліся. Хоць многія праблемы маглі б даволі хутка вырашыцца. Часцей за ўсё інфармацыя да нас прыходзіць ужо позна, калі адмена ўсынаўлення адбылася.

Каб зменшыць колькасць адмен, НЦУ стварае сёння сістэму суправаджэння бацькоў-усынавіцеляў. Так, напрыклад, адкрыты клуб для бацькоў-усынавіцеляў, для ўсыноўленых дзяцей, дзе з дзецьмі працуюць псіхолагі. Пачалі наладжваць работу з дзіцячымі дамамі сямейнага тыпу і прыёмнымі сем'ямі, каб прадухіліць выгаранне прыёмных бацькоў і даць магчымасць выхавацелям высокага ўзроўню дапамагчы маладым усынавіцелям. У сацыяльных сетках стварылі групу для ўсынавіцеляў і прыёмных бацькоў, дзе людзі могуць падтрымаць адно аднаго, задаць пытанне спецыялістам і атрымаць кампетэнтны адказ.

— Усе гэтыя групы толькі пачалі сваю работу, — гаворыць дырэктар Вольга Глінская. — Але ўжо прайшлі першыя сустрэчы. Удзельнікі былі вельмі задаволены, бо ўжо на пачатку свайго бацькоўства адчуваюць, што не застануцца сам-насам са сваімі праблемамі. Ёсць людзі, якія прыйдуць ім на дапамогу. Магчыма, такая форма суправаджэння дазволіць скараціць колькасць дзяцей з паўторнай траўмай страты.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Конкурс

# ШЧЫРЫ ПОГЛЯД

**У Мінску падведзены вынікі Рэспубліканскага конкурсу дзіцячага выяўленчага мастацтва «Свет маімі вачыма» для дзяцей-сірот і дзяцей з інваліднасцю.**

Конкурс праходзіў у рамках праграмы Беларускага дзіцячага фонду «Юныя таленты».

— На наш погляд, самае каштоўнае ў работах, прадстаўленых на конкурс, — шчырасць, — лічыць **дырэктар РГА «Беларускі дзіцячы фонд» Аляксандр ТРУХАН.**— У гэтых работах і радасць, і дабрыня, і ўменне бачыць прыгожае, чэрпаць у ім натхненне і энергію. Такі конкурс — магчымасць для нас, дарослых, убачыць свет дзіцячымі вачыма.

У склад журы ўваходзілі вядомыя мастакі, мастацтвазнаўцы і блогеры. Партнёрамі конкурсу сталі ААТ «БПС-Ашчадбанк», кампанія «MasterCard» і прадпрыемства «Кока-кола Беўрыджыс Беларусь».

— Я ўражаны тым, што атрымаў трэцяе месца, — гаворыць **Нікіта РАГАЎЦОЎ, удзельнік конкурсу.** — Вучуся ў Магілёўскім дзяржаўным эканамічным прафесійна-тэхнічным каледжы, мая будучая прафесія не мае ніякага дачынення да выяўленчага мастацтва. Аднойчы зайшоў у кабінет да нашага выкладчыка падчас нейкага творчага хаосу, спытаў у дзяцей, што яны тут робяць, — аказалася, малююць. Застаўся паглядзець, паспрабаваў і сябе. Наша выкладчыца Данута Чэх-Астрашэўская заўважыла, што ў мяне ёсць здольнасці. Вось і прапанавала паўдзельнічаць у конкурсе. Цяпер вось хаджу маляваць у майстэрню кожны тыдзень. Сам у шоку!




**Пераможцы конкурсу — навучэнцы Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа з выкладчыцай Данутай ЧЭХ-АСТРАШЭЎСКАЙ.**

У конкурсе бралі ўдзел дзеці і падлеткі ад 10 да 18 гадоў, якія засталіся без апекі бацькоў або маюць абмежаваныя магчымасці. Конкурс праходзіў са снежня 2018 года да сакавіка 2019-га ў дзвюх намінацыях — жывапіс і графіка. Усяго ў ім прыняло ўдзел каля 500 дзяцей з розных рэгіёнаў Беларусі. У выніку журы вызначыла 19 пераможцаў — яны атрымалі дыпломы і мастацкія прылады для творчасці. Яшчэ 21 удзельнік узнагароджаны памятнымі падарункамі ад членаў журы.

Але самым каштоўным падарункам стала выстаўка. Сорак работ пераможцаў і ўдзельнікаў конкурсу можна ўбачыць у Нацыянальным гістарычным музеі да 23 красавіка.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Пра «гэта»

# ЧАС ДЛЯ ЗАКАХАНАСЦІ

## Як яе пражыць падлеткам і перажыць бацькам

**Ці трэба бацькам імкнуцца да таго, каб дзеці пасвячалі іх у свае асабістыя сакрэты і ў якім узросце не позна расказаць пра правілы першага спаткання? Як увогуле да яго падрыхтаваць падлетка? Што павінны пра «гэта» расказваць бацькі дашкольнікам і старшакласнікам? Колькі жыве закаханасць (і як без яе жыць далей)? Якія этапы ўзаемаадносін абавязкова павінны прайсці маладыя людзі, каб стварыць шчаслівы шлюб (ці бязбольна разарваць адносіны)? Пра гэта нам расказалі каардынатар цэнтра, дружалюбнага да падлеткаў, «Давер» Валянціна ШУКАН і псіхолаг-кансультант Святлана ПАЛЯШЧУК.**

**— У якім узросце дзеці пачынаюць цікавіцца супрацьлеглым полам?**

**В. Ш.:** — Гэта адбываецца не ў падлеткавым узросце, а значна раней. Першае каханне можа здарыцца і ў дзіцячым садку. Калі маленькія дзеці абдымаюцца, дзеляцца цукеркамі, гэта першыя праявы сімпатыі.

**С. П.:** — Дзесьці ў дзесяць гадоў у дзяцей ужо відавочнае дзяленне на хлопчыкаў і дзяўчынак. І тут сімпатыю хлопчыкі часта праяўляюць у выглядзе агрэсіі: калі дзяўчынка падабаецца, яе будуць чапляць, тузаць за касу. Гэта праяўляецца і праз сумесную гульню: менавіта з гэтай дзяўчынкай хлопчык будзе гуляць у даганялкі, хованкі і іншае. Але пакуль гэта ўсё без сексуальнага падтэксту. Ён з'явіцца да пачатку палавога выспявання, і тады размова ідзе аб утварэнні пар. Прыкладна ў 13—14 гадоў утвараюцца першыя пары. Таму бацькі павінны не спазніцца і правесці пэўны лікбез: як паводзіць сябе на першым спатканні, як рабіць кампліменты дзяўчынцы, пра межы дазволенага... Як правіла, бацькі спазняюцца — пачынаюць даваць парады, калі пара ўтварылася.

**— Па якіх прыкметах бацькі могуць здагадацца, што сын ці дачка закахаліся?**

**С. П.:** — Лепш, канешне, калі з бацькамі ёсць эмацыянальны кантакт і дзеці расказваюць самі. Але і так нескладана заўважыць, што малады чалавек пачынае ўдзяляць больш увагі правілам гігіены: бацькам ужо не трэба лішні раз нагадваць пачысціць зубы, памяняць шкарпэткі. З'яўляецца больш увагі да сваёй знешнасці.

**В. Ш.:** — У дзяўчат увага да знешнасці таксама выходзіць на першы план. Калі раней яна выбягала гуляць на вуліцу, як толькі яе паклікалі, то цяпер падумае, ці не трэба памыць галаву, прыгожа апрануцца, нафарбавацца, што таксама робіцца для таго, каб падабацца супрацьлегламу полу. Гэта калі і не закаханасць, то гатоўнасць да таго, што нехта можа сустрэцца.

**— Што да перыяду першай закаханасці павінны паспець растлумачыць бацькі?**

**С. П.:** — Самае элементарнае — падрыхтаваць падлетка да першага спаткання. Пажадана, каб з хлопчыкам пагутарыў тата, з дзяўчынкай, адпаведна, мама. Добра, калі бацька растлумачыць хлопцу, як запрасіць дзяўчынку на спатканне, як расказаць ёй пра свае пачуцці, што можна і чаго нельга рабіць падчас першай сустрэчы. Часта ўзнікае і камунікатыўны бар'ер — пра што размаўляць на працягу гадзіны. Таму да спаткання трэба падрыхтавацца: мець запас пытанняў. Сёння праз сацсеткі нескладана высветліць зону цікавасцяў хлопца ці дзяўчыны. Калі малады чалавек захапляецца футболам, то дзяўчынцы не лішнім будзе даведацца, калі выступае яго любімы клуб, хто ключавыя гульцы ў камандзе, каб падтрымаць размову.

Зразумела, пару маладыя людзі выбіраюць па знешнасці, але гэтага недастаткова, каб завязаць устойлівыя адносіны. Феномен Папялушкі, якая згубіла туфлік, і прынц яе шукаў, сёння не працуе. Але ў некаторых дзяўчат такая ўстаноўка захоўваецца: я прынцэса, і вакол мяне лётаюць, як пчолы, маладыя людзі. Дзяўчынка павінна чымсьці захапляцца, хоць бы вышываць крыжыкам. І калі яна ўмее пра гэта цікава, нешаблонна, нестандартна расказаць, яна прыцягне ўвагу. Калі ж клопат толькі пра знешнасць, то стварыць устойлівую пару дастаткова складана, нават маючы выдатныя даныя.

**— У якім узросце бацькам не рана і не позна размаўляць з падлеткамі пра секс? Што павінны растлумачыць бацькі?**

**В. Ш.:** — Калі мы кажам пра палавое выхаванне, то заўсёды акцэнтуем увагу на тым, што яно пачынаецца не з падлеткавага ўзросту, а ледзь не з моманту нараджэння. К шасці гадам у хлопчыкаў і дзяўчынак фарміруецца дакладнае ўяўленне аб сваёй палавой прыналежнасці. Палавое выхаванне пачынаецца з гендарных роляў: у сям'і ёсць мама і тата, і яны пара. І калі гэта пара, яны абдымаюцца, цалуюцца, у іх абавязкова будуць дзеці. Пра гэта нават не трэба расказваць, маленькія дзеці гэта бачаць у сваёй сям'і. Яшчэ да моманту палавога выспявання бацькі павінны пагаварыць пра тое, як устроена цела, што з ім будзе адбывацца далей. Але пытанні рэпрадукцыі трэба абмеркаваць раней. «Адкуль я ўзяўся?» — пытаюць ужо дашкольнікі. Трэба растлумачыць, што калі маладыя людзі падабаюцца адно аднаму, яны ўступаюць у шлюб, праз пэўны час у іх нараджаюцца дзеці. Тое, што нейкі час ты жыў у мамы ў жывоціку, потым нарадзіўся, таксама расказаць варта.

**С. П.:** — Цяпер шмат літаратуры па ўзросце, і з яе дапамогай бацькі могуць паказаць, як і што адбываецца. Пачынаць варта з рознасці палоў і ўяўлення, як устроены хлопчык і дзяўчынка. Што датычыцца сексу, то к шасці-сямі гадам дзеці пачынаюць задаваць гэта пытанне. І не таму, што ім цікава, — яны проста чуюць гэта слова. Зараз у нас насычаная інтэрнэт-прастора, тэлебачанне, дзеці бачаць і пытаюцца. Яны яшчэ не гатовы да гутаркі на гэту тэму, і бацькам не варта падрабязна ўсё тлумачыць. Спачатку трэба пацікавіцца, дзе ты гэта слова пачуў. Магчыма, у школу ўжо нехта прынёс пэўную відэапрадукцыю. Калі дзіця сутыкаецца з такой інфармацыяй у раннім узросце, непадрыхтаваным, яно, канешне, траўмуецца. У яго ўзнікае пытанне: няўжо тата і мама гэта робяць?! І тут вельмі важна растлумачыць яму паняцце інтымнасці: што ёсць часткі цела, якія бачыць толькі доктар, і што ўзаемаадносіны паміж мужчынам і жанчынай — таксама інтымныя рэчы. Усё, што адбываецца ў спальні, гэта тайна дваіх, мамы і таты. І калі ты выйдзеш замуж ці ажэнішся, у цябе таксама будуць узаемаадносіны з іншым чалавекам.



Фота БелТА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**— У якім узросце можна пачынаць інтымныя адносіны?**

**С. П.:** — Часта падлеткі прывязваюць гэта да ўзросту згоды — 16 гадоў, бо тады не будзе юрыдычнай адказнасці. Але гэта занадта ранні час для палавога дэбюту. Рэпрадукцыйная сістэма саспявае ў 18 гадоў — па фізічных і псіхалагічных прычынах. І мы павінны разумець, што існуюць этапы ўзаемаадносін. Падлеткам мы тлумачым, што ў адносінах пары існуюць этапы, і яны павінны быць абавязкова пройдзеныя. Яны маюць дакладныя часавыя межы і свае мэтавыя ўстаноўкі. За знаёмствам ідзе этап заляцання. Асноўная яго задача — фарміраванне прыхільнасці. Гэта той перыяд, калі вы разам ходзіце ў кіно, вывучаеце інтарэсы адзін аднога, бываеце ў агульнай кампаніі, каб у вас склалася ўяўленне пра гэтага чалавека. Этап заляцання павінен быць напоўненым, змястоўным, цікавым. Гэта адзін з асноўных этапаў, які забяспечвае ў будучым дабрабыт шлюбу. Яго мінімальныя межы — шэсць месяцаў устойлівага кантактавання. Гэта не заўсёды дарагія падарункі, прыгажосць заляцанняў не ў гэтым. Пажадана пабываць у тым месцы, дзе вы ніколі раней не былі, напрыклад, схадзіць на каток — так фарміруюцца агульныя цікавасці. Калі мы падыходзім да наступнага этапу — закаханасці, то ўжо ёсць жаданне заставацца сам-насам, нікуды не хадзіць, а пабыць разам. Праз паўгода можна пазнаёміць і з мамай-татам, каб бацькі мелі ўяўленне, што вы з кімсьці кантактуеце.

Часта да нас прыходзяць дзяўчаты, калі адносіны разарваныя: хлопец паехаў у Амерыку і нават не сказаў пра гэта. І калі мы пачынаем абмяркоўваць, колькі вы ведалі адно аднаго, то перыяд заляцання скарачаецца да двух тыдняў. Праз тры месяцы ўзніклі інтымныя адносіны, а праз чатыры — разрыў. Гэта заканамерна, бо парушаны ўсе этапы ўзаемаадносін.

**В. Ш.:** — Такая лесвіца ў выглядзе этапаў дае магчымасць у пэўны перыяд пакінуць гэтыя адносіны і пачаць усё з пачатку. Пазнаёміцца з іншым чалавекам, штосьці зразумець пра яго, зноў пакінуць і бязбольна пачаць з нуля. Часта ўяўленне ў моладзі такое: каб пацвердзіць сваё добрае стаўленне, абавязкова трэба нейкія інтымныя рэчы рабіць. «Калі ты мяне любіш, дашлі мне сваё аголенае відэа ці фота». І дзеці часам пацвярджаюць свае добрыя адносіны да чалавека, якога яны, здараецца, ведаюць толькі праз інтэрнэт. Варта ім тлумачыць, што не такім чынам гэта робіцца. І ўвогуле ёсць рэчы ў адносінах, на якія ўстаноўлены жорсткія забароны.

**— Якія гэта рэчы?**

**В. Ш.:** — Напрыклад, калі ён ці яна цябе зневажае ці прыніжае, прылюдна ці сам-насам, адназначна гэтыя адносіны трэба абарваць, бо яны непрадуктыўныя. Ніхто ў пары не мае права зневажаць іншага чалавека, гэта псіхалагічны гвалт. Маладыя часта гэта церпяць: маўляў, а раптам больш ніхто мяне не пакахае? Такія сузалежныя стасункі не будуць прыносіць задавальнення. А калі яны будуць падмацоўвацца яшчэ і інтымнымі адносінамі, то разарваць іх фактычна немагчыма. Секс адыгрывае сваю цэментуючую ролю. У шлюбе, напрыклад, ён прызваны згладжваць канфліктныя сітуацыі ў першы год жыцця. Бо па-іншаму не маглі б захоўвацца маладыя сем'і.

**«Калі дзіця сутыкаецца з такой інфармацыяй у раннім узросце, непадрыхтаваным, яно, канешне, траўмуецца. У яго ўзнікае пытанне: няўжо тата і мама гэта робяць?!»**

**С. П.:** — Перыяд закаханасці доўжыцца стольki, колькі жыве ідэальны вобраз партнёра, які мы сабе намалявалі. Па часе — да паўтара гадоў. Пасля гэтага ў норме ідэальны вобраз распадаецца, і мы бачым рэальнага чалавека з яго недахопамі. Малады чалавек хавае брудныя шкарпэткі пад канапу — ці гатова я мірыцца з гэтым недахопам? Гэта можа быць няверчасць, калі ён сустракаўся з яшчэ адной дзяўчынкай. Можа быць і злоўжыванне алкаголем. Перад намі рэальны чалавек, рэальныя ўзаемаадносіны, і вось тут трэба ўзважыць, ці гатовы мы менавіта з ім будаваць нешта далей. Таму калі ў перыяд закаханасці ці заляцання маладыя людзі ўступаюць у інтымныя адносіны, гэта дзейнічае як цэмент і перашкаджае механізму разрыву адносін у той сітуацыі, калі стасункі відавочна непрадуктыўныя. Тады закаханасцьператвараецца ў сузалежнасць, і гэта ўжо праблема. І падлеткі не ў стане з-за свайго ўзросту, несфарміраванай самасвядомасці адрозніваць закаханасць і сузалежнасць. Таму мы заўсёды арыентуем іх на ўстрыманне, каб яны маглі навучыцца камунікацыі, маглі падабраць чалавека па інтарэсах, які цалкам іх задавальняе. Адносіны ў пары могуць быць і без сексу, як ні дзіўна гэта сёння гучыць. І гэта будуць добрыя трывалыя адносіны. На спатканні ёсць межы дазволенага: гэта пацалункі, абдымкі, калі размова ідзе пра этап закаханасці. І 85 % маладых людзей схільныя да ўстрымання. Яны здольныя сублімаваць сваю сексуальную энергію ў творчую, у спорт, у іншыя дасягненні.

А на пытанне «калі пачаць?» адказ просты: калі маладыя людзі гатовы да ўступлення ў шлюб. Інтымныя адносіны прадугледжваюць з'яўленне трэцяга. Таму павінна прысутнічаць гатоўнасць мець дзяцей, работу і магчымасць стварыць незалежную ад бацькоў сям'ю.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ПЯРЛОЎКА ДА БЕРЛІНА ДАВЯЛА


...праз 61 год разам.

### «Паміраць дык разам»

Акурат над столікам, за які мы з Ганнай Пракопаўнай сядаем піць чай, вісіць невялікі малюнак у рамцы. На ім украінская хатка-мазанка патанае ў высокай траве, пад акном кучаравіцца маладая бярозка.

— Ваш дом? — пытаюся.

— Я там нарадзілася ў 1925 годзе. Вёска Дацэнкоўка, што ў Сумскай вобласці, — тлумачыць жанчына. — Раней, калі здароўе дазваляла, я досыць часта выступала перад школьнікамі. Расказвала, дарэчы, не толькі пра вайну, але і пра тое, што было да яе. Маладым карысна паслухаць пра жыццё без тэлефонаў і электрычнасці. Мы былі першым вясковым пакаленнем, якое ў абавязковым парадку вучылі грамаце. Зімой я бегала ў чатырохгодку басанож па снезе. Усё лета штодзень ірвала па два мяхі крапівы голымі рукамі — толькі б кабанчыка адкарміць, прадаць і набыць паліто. Без яго ў сямігодку маці б не пусціла. А мне так хацелася, там такая настаўніца была! Адукаваная, мудрая. Я ўсё дзяцінства марыла быць на яе падобнай. Падчас галадамору (масавы голад на Украіне ў 1932—1933 гадах. — **Аўт.**) мы, дзеці, елі толькі ў школе. Матулі па чарзе гатавалі нам жыдзенькі суп з таго, што маглі знайсці. Пасля абеду настаўніца казала: «Калі прыйдзеце дадому, а бацькі нічога паесці не дадуць, не плачце, лепш кладзіцеся спаць. Вы ж сёння паелі, гэтага маленькаму арганізму на тры дні павінна хапіць». Праз шмат гадоў я зразумела, што менавіта вера ў лепшае, пазітыўны настрой нас і выратавалі. У тыя гады многія паміралі не толькі ад голаду, але і ад страху. Баяліся да смерці ў літаральным сэнсе...

У 1941-м пятнаццацігадовая Аня Лабанава, скончыўшы сямігодку, падалася да старэйшай сястры ў Варашылаўград (цяпер Луганск). Планавала працягнуць вучобу: не пакідала мара стаць настаўніцай. Магчыма, так бы яно і было, але прыйшла вайна. Ганна Пракопаўна добра памятае 22 чэрвеня. Напярэдадні ў яе жыцці здарылася вельмі важная падзея — першы паход у фотасалон. Напамін пра той дзень і цяпер вісіць на сцяне ў кватэры ветэрана. На чорна-белым здымку — дзяўчына-падлетак. Ясны позірк, светлыя ленты ў косах, усё жыццё наперадзе.

— Не верыцца, што гэта я, — быццам саромеючыся, адводзіць вочы жанчына. — Тады я ўпершыню даведалася пра існаванне Брэсцкай крэпасці, ды і пра горад Брэст (геаграфію ў школе выкладалі добра, проста ў вёсцы не было ніводнай карты). Здавалася, што гэта так далёка і да нас немцы проста не змогуць дабрацца. Аднак тэлеграма ад мамы насцярожыла: «Вяртайся дадому. Паміраць дык разам». Яна адчувала, што нас чакаюць вялікія выпрабаванні. Але я не паехала.

У жніўні 1941-га Ганна, яе сястра і трое дзяцей выехалі ў Казахстан. Душны, цёмны эшалон. Навокал шмат дзяцей, якія апынуліся ў эвакуацыі.

— Помню, на вакзале ў Алма-Аце абвяшчалі: «Прыбыў цягнік. Просім забраць дзяцей. Іх бацькі жывыя, яны адсталі ў дарозе». За гадзіну малых разабралі казахстанскія сем'і, потым падыходзіў наступны эшалон, — расказвае жанчына. — Для нашай вялікай кампаніі месца знайшлося толькі ў вёсцы. Я працавала ў калгасе, сястра сядзела з дзецьмі. У непагоду нават паспявалі вязаць рукавічкі і шкарпэткі, якія адпраўлялі на фронт. Жылося нядрэнна, але праз некаторы час дзеці пачалі хварэць. Вырашылі ехаць назад. Думалі, пакуль дабяромся, вайна скончыцца. Маскву ж адстаялі! Так і даехалі да Белгарадчыны, праз якую адступалі нашы войскі.


Пра таварышаў са свайго батальёна Ганна Пракопаўна ўспамінае, беручы ў рукі пажоўклыя фотакарткі і зачытаныя да дзірак лісты.

### «Шрапнель», яна ж «бранябойна-запальная»

— Шаснаццацігадовая дзяўчынка пайшла кашаварыць на фронт — сёння гэта гучыць дзіўна, а тады мы марылі дапамагчы чым-небудзь арміі. Я спачатку выходзіла на рамонт дарог, па якіх адступала наша тэхніка. Неяк убачыла аб'явы пра набор повараў і зразумела — вось мой шанц. Досвед работы на палявой кухні быў: у Казахстане мы па чарзе варылі абеды, убіраючы хлеб. Таму, калі сястра эвакуявалася другі раз, я пайшла ў 123-і асобны аўтатранспартны батальён, які абслугоўваў аэрадромы. Спачатку вольнанаёмнай, мяне нават у спіс не ўносілі. Думалі, часова кашку павару, стамлюся і сыду. А я ўзяла і да Берліна праз Сталінград дайшла! — смяецца Ганна Пракопаўна. — Першыя месяцы былі спакойныя. Стралялі, канешне, але недзе далёка. Я нават пачала думаць, што вайна — гэта не так ужо і страшна. Стаяў ліпень 1942-га, мы знаходзіліся каля самага Дона...

Тады яна нават уявіць не магла, што апынецца ў самым пекле падчас баёў за Растоў-на-Доне, а сёння ўспамінае перажытае спакойна, без слёз.

— Нямецкія самалёты, не шкадуючы боепрыпасаў, пасыпалі нас імі праз кожныя 15 хвілін. Не схаваешся, не збяжыш... Калі чарговы раз мы з напарніцай Машай кінуліся на зямлю, мне падалося, што па мне «нехта прабег», закрануўшы галаву. Усё сцішылася. Падымаю вочы і бачу застылы твар сяброўкі: рот адкрыты, вочы не міргаюць. Што здарылася? Праз імгненне адчуваю, што па лбе цячэ кроў і павольна капае на маю гімнасцёрку. Балюча? Страшна? Не. Я тады думала пра сапсаваную форму, нахілялася да вады адмыць кроў. Гляджу — мае косы паплылі. Вось гэта мяне напужала. Аказалася, асколак рассек адну касу, прайшоў праз другую і засеў у галаве. Як мне пашанцавала, што я хавала валасы пад бярэткай! Гэта мяне і выратавала.

Ганне Пракопаўне пашчасціла трапіць у аўтатранспартны батальён (а не артылерыйскі ці танкавы, якія ўвесь час былі пад абстрэлам). Тым не менш вораг пастаянна стараўся зачапіць шафёраў. «Вадзіцелі ў Чырвонай арміі былі вялікім дэфіцытам. Немцы гэта ведалі і імкнуліся іх «прыбраць». Калі зверху стралялі, дык у кабіну мецілі». На гэтым фоне малады повар і вучылася гатаваць на сотню-другую галодных ратоў.

— Калі мяне прывялі знаёміцца з поварам (сапраўдным, з адпаведнай адукацыяй), ён быў настолькі выпрацаваны і стомлены, што нават стаяць сам не мог. Таму першую «салдацкую кашу» прыйшлося варыць самастойна. Паставілі перада мной мех: перабірай. Я аж абамлела. Успомніла, як дома маці давала шклянку з зернем і трэба было аддзяліць пшано ад проса. Паўдня мучылася, а тут цэлы мяшок! Убачыўшы спужаны твар, мяне «супакоілі»: «Пашуруй рукамі, каб мышы павыскоквалі». Я ад гэтых слоў яшчэ больш напружылася, — зноў усміхаецца Ганна Пракопаўна. — Каша той раз атрымалася ладная. Доктар пахваліў, хлопцы елі так, што за вушамі трашчала. Няладнае наш повар заўважыў, калі байцы пачалі прасіць дабаўкі. «Пярлоўку давалі тры разы на дзень, усе яе ледзь у сябе запіхвалі. А тут — дабаўкі!» Паглядзеў повар на правізію і ўсё зразумеў: я ўкінула ў кашу ўсё масла, што было. Нам за той пралік пасля яшчэ некалькі месяцаў не дадавалі прадуктаў. Затое шафёры ўсю вайну пыталіся: «Аня, ну калі ты зварыш нам такі абед, як першы раз?»

Франтавы повар — гэта калі ты не толькі каля вогнішча з ранку да ночы стаіш. Твае задачы — дровы нарыхтаваць, ваду знайсці і ачысціць (бралі мы яе з рэк, азёр, балот, канаў і нават лужын), акрамя таго, выкапаць сабе абарончы акоп. Рабочы дзень звычайна цягнуўся каля дваццаці гадзін, а было, што і ўсе дваццаць чатыры. Спалі седзячы на стуле, паклаўшы галаву на спінку.

— Страву з пярлоўкі байцы называлі «шрапнель», ці «бранябойна-запальная», з проса — «бландзінка», ці «страявая». Гатавалі мы таксама з гароху і аўсянкі, прывозілі са склада кансервы і мяса. Але былі дні, калі гатаваць прыходзілася літаральна з «нічога». Бярэш вядро і выходзіш «у народ»: хто сухар ці бульбіну кіне, хто гароху адсыпле, у каго канцэнтрат пшана застаўся.

### Каханне, дастойнае кінастужкі

— З мужам таксама на фронце пазнаёміліся? — пытаюся, гледзячы на шматлікія партрэты Васіля Воранава, якія жанчына раскладвае перада мной.

— Не. Наша гісторыя кахання пачалася да вайны, — голас Ганны Пракопаўны становіцца загадкавым, а ў вачах з'яўляюцца іскрынкі. — Помню, быццам гэта было ўчора: я прыехала да сястры ў горад Сумы і выйшла прагуляцца з яе гадавалым сынам. Адна незнаёмая вуліца, другая, сама не ведаю, як апынулася ў двары сярод гаманкіх дзяцей і дзяўчат. Раптам выйшла з дома жанчына ва ўзросце з фотакарткамі: «Людзі, паглядзіце! Васько мой які стаў». Здымкі пераходзілі з рук у рукі, дайшоў адзін да мяне. Як глянула — так адразу і закахалася. Малады, прыгожы. Вачэй не адарваць. Неўзабаве мой пляменнік заплакаў, я адыйшла на хвілінку. Калі вярнулася, жанчыны ўжо не было. Як яе зваць? Куды несці фатаграфію Васі? Невядома. Так у мяне гэтая картачка і засталася. Я не ведала ні яго прозвішча, ні ўзросту, ні адраса.

Ці ж магла дзяўчынка ўявіць, якія дзівосныя, не падпарадкаваныя ніякай логіцы падзеі чакаюць яе наперадзе?

— Цяпер ніводны фільм пра вайну не абыходзіцца без любоўнай лініі. Аднак у рэальнасці ніякія шуры-муры не дапускаліся. Былі ў нас двое — муж і жонка. Тры гады таіліся і пра свой шлюб нікому ні слова. Пакуль яна не захварэла на малярыю. Сабраліся камісаваць, і тут раскрылася яе цяжарнасць на першых месяцах. Ой, які падняўся шум! Такі сорам для батальёна! Прыйшлося парачцы прызнацца, кім яны адно аднаму насамрэч прыходзіліся. Ці яшчэ выпадак. Неяк да камісара Кузняцова прыехала жонка. Толькі ён яе прыабняў, гэта ўбачылі іншыя: «Хто такая? Жонка? Дзе дакумент? Няма? Пад арышт». А калі сапраўды пацвердзілася, што яны муж і жонка, — кіраўніцтва адразу ж іх па розных часцях развяло. Вайна ёсць вайна.

Аднак пачуцці і памкненні маладых палкіх сэрцаў ніхто не адмяняў. Да самой Ганны Пракопаўны байцы «сваталіся» пастаянна.

— Я ўсіх пасылала к чорту без разбору. Аднойчы мой грубы адказ пачуў камсорг і такі «прачухрай» мне зладзіў: «Ты думаеш, хлопцу лёгка ў каханні прызнацца? Тры словы дзяўчыне — гэта складаней, чым у штыкавую атаку ісці». Ён жа мяне і навучыў адказваць усім, быццам у мяне жаніх ужо ёсць. У мяне якраз была фотакартка незнаёмца ў будзёнаўцы, — на хвілінку жанчына замаўкае, прыпамінаючы былое. — І вось, калі падчас вайны ехала дадому ў водпуск, то прыязджала праз Сумы. Там на вакзале мяне спыніла жанчына: «Ці не чулі вы што пра Васю Воранава?» Чуць я не чула, але параіла жанчыне напісаць свайму сыну ліст, калі ёсць адрас. «Сама не напішу, граматы не ведаю. Дапаможаш? Я табе гарбаты заварю». Яна была такой настойлівай, што адмовіцца я не змагла. Толькі мы пераступілі парог яе кватэры, у мяне падкасіліся ногі. На сцяне вісеў партрэт таго самага Васько, у якога я закахалася перад вайной па фотаздымку. Наплакаліся мы тады з яго мамай, паўспаміналі мірны час, а пасля і ліст яе сыну напісалі. Унізе пазначылі, што вестку ад матулі пісала зямлячка Аня.

Ліставанне цягнулася паміж Васілём і Ганнай тры доўгія гады. Лісты ад каханага Васі — самыя дарагія для яе. Шкадуе толькі, што не захаваліся самыя першыя. Іх пісалі на палях газет — вось дзе кожнае слова было з сэнсам! Вучыся, моладзь! Гэта вам не паведамленні ў «тэлеграме» страчыць.

— Васіль прыехаў у водпуск толькі ў сакавіку 1947-га. Першае, што я ад яго пачула: «Дзе ж вашыя касічкі?» Ведаў жа мяне толькі па фота. А я акурат да Міжнароднага жаночага дня абрэзала валасы, тады так модна было. Тым не менш знаёмства адбылося. Схадзілі мы ў кіно, пасля ў тэатр, на танцы... Адным словам, апошні дзень перад ад'ездам падкраўся незаўважна. Тады каханы і запрасіў мяне ў загс.

— Вясельную сукенку памятаеце?

— Якая сукенка, дзетачка? Я распісвалася ў Васевых ботах. Ён прыехаў у новенькіх хромавых, мне іх і аддаў. Бо ўсё, што мела я, — кірзаўцы 43-га памеру, пры тым што мае ногі — 35-га. Зімой запіхвала ўнутр паперу, анучы, летам бегала басанож... Ой, усякае было. І цяжка, і страшна, і балюча. Але разам, душа ў душу, 61 год ішлі па зямлі, — прызнаецца ветэран, і, каб не заканчваць размову на сумнай ноце, прызнаецца: — Ведаеце, Брэст для нас з Васем — самы любімы горада. Стаў ім яшчэ тады, калі мы праязджалі праз яго, вяртаючыся з Германіі, дзе муж служыў, дадому. Нават хадзілі тут у парк і кідалі пятакі ў фантан, каб вярнуцца. Як толькі Васіль пайшоў у адстаўку — мы без роздумаў пераехалі ў горад над Бугам. Хораша тут!

**Ганна КУРАК.**

**Фота аўтара і з архіва гераіні.**

*Мінск — Брэст — Мінск.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Санаторый «Случ»: адпачынак з карысцю

**АДЗІН з найлепшых дзіцячых санаторыяў Беларусі «Случ» да новага летняга сезона рыхтуе шэраг сюрпрызаў для наведвальнікаў. Тут адкрыецца сучасны спа-комплекс з трыма саўнамі: фінскай, саляной, турэцкім хамамам, а таксама абноўленым басейнам. Да тэніснага корта, пляцовак па валейболе і пляжным футболе дабудуюць баскетбольную пляцоўку з прафесійным пакрыццём. Дадайце сюды камфортныя нумары для пражывання, шасціразовае харчаванне, поўны набор лячэбных працэдур і цікава арганізаваны вольны час — і вы зразумееце, чаму набыць пуцёўку ў «Случ» не так і проста.**



У спелеакліматалячэбніцы.

## Адзін з найлепшых у краіне



— Два гады таму мы правялі вялікае капітальнае абнаўленне: рэканструявалі залы харчовага блока, закупілі новае кухоннае абсталяванне. Пабудавалі культурна-забаўляльны комплекс «Вясёлка» — сучасную дыскатэчную пляцоўку, — расказвае **дырэктар філіяла «Дзіцячы санаторый «Случ» ААТ «Белагараздраўніца» Сяргей МАРАЧКОЎСКІ.**

У той жа час быў здадзены новы спальны корпус «Маці і дзіця», дзе стварылі камфортныя ўмовы для сямейнага адпачынку. Тут 23 пакоі на 40 чалавек. Акрамя гэтага, у санаторыі маецца пяць спальных карпусоў. Адначасова тут могуць размясціцца 500 дзяцей.

— У 2018 годзе ў нашым санаторыі адпачыла больш за 7500 дзяцей з Беларусі, а таксама каля 200 з Расіі. Ужо 15 гадоў мы працуем па праграме Саюзнай дзяржавы па арганізацыі лячэння і аздараўлення дзяцей з раёнаў Беларусі і Расіі, якія найбольш пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС. Для гэтага штогод удзельнічаем у адкрытым конкурсе, які праводзіць Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы, дзе вызначаюць найлепшыя санаторыі. За паўтара дзесяцігоддзя мы аздаравілі каля 2,5 тысячы расійскіх школьнікаў з Бранскай, Калужскай, Тульскай абласцей і Алтайскага краю, — расказвае дырэктар.

Дарэчы, нядаўна Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы адзначаў



У час сеанса прэсатэрапіі.

санаторый «Случ» падзякай «За значны ўклад у развіццё беларуска-расійскага супрацоўніцтва і рэалізацыю сацыяльна-значных праектаў Саюзнай дзяржавы». Зрэшты, узнагароды «Случ» атрымлівае штогод. Напрыклад, сёлета ён заняў другое месца сярод дзіцячых санаторыяў краіны паводле вынікаў работы за 2018 год. Чарговую Ганаровую грамату з гэтай нагоды Сяргей Марачкоўскі атрымаў ад дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзя Балбатоўскага.

— Аздараўляюцца ў нас і спартыўныя каманды. Ужо некалькі гадоў, напрыклад, прыязджаюць юныя баскетбалісты клуба «Цмокі-Мінск». Не першае лета ў нас праводзяць выхаванні сталічнай балетнай школы Вежнавец, — кажа Сяргей Марачкоўскі.

Штогод у санаторыі ўдасканальваюць матэрыяльна-тэхнічную базу. Вялікую ўвагу аддаюць бяспецы дзяцей.

— Дзіцячы санаторый адносіцца да тых аб'ектаў, дзе забеспячэнне бяспекі адыгрывае ключавую ролю, — падкрэслівае дырэктар. — Нядаўна мы цалкам мадэрнізавалі сістэму супрацьпажарнай абароны. Падтрымліваць бяспеку на належным узроўні дапамагае ўстанаўленае ў жылых карпусах, на тэрыторыі санаторыя, у харчаблоку і іншых памяшканнях відэаназіранне.

## Жывая прырода і спа-працэдуры

Санаторый «Случ» знаходзіцца ў найпрыгажэйшым месцы — пасярод змешанага лесу, побач са штучным вадасховішчам. Таму тут можна зранку ўбачыць саву, кажаноў ці зайца — жывая прырода падступае нязвыкла блізка. Акрамя традыцыйных бяроз, дубоў, каштанаў і елак, на тэрыторыі растуць туі, ядловец, барбарыс, брызгліна, дуброўка, фарзіцыя. А сапраўдным упрыгажэннем з'яўляецца ліпавая алея, якая цягнецца ўздоўж тэрыторыі санаторыя. Галасы птушак і чыстае паветра — што яшчэ патрэбна для шчасця?

Дзеці традыцыйна праводзяць тут тры тыдні. Гэтага часу хапае, каб умацаваць здароўе. Тут ёсць увесь набор неабходных працэдур: спелеалячэбніца, лячэбныя гразі і ванны, інгаляцыі, розныя віды масажу, электра-, цепла- і святлолячэнне, лазератэрапія, кабінеты функцыянальнай дыягностыкі і залы лячэбнай фізкультуры. На тэрыторыі маецца ўласная свідравіна з мінеральнай вадой.

Штат медработнікаў цалкам укамплектаваны. Тут працуюць чатыры ўрачы-педыятры, тэрапеўт, фізіятэрапеўт, зубны фельчар. Паводле слоў **намесніка дырэктара Ларысы БОНДАРАВАЙ,** у санаторыя некалькі кірункаў аздараўлення: сістэмы кровазвароту, органаў дыхання, касцёва-мышачнай сістэмы, органаў стрававання і мочапалавой сістэмы.

Апошнім часам пашыраецца выбар касметалагічных і спа-працэдур. Адна з самых папулярных — прэсатэрапія, або пнеўмакампрэсійная тэрапія. Гэта масаж сціснутым паветрам, якое падаецца праз спецыяльны касцюм. Уздзейнічаць можна як на ўсё цела, так і асобныя яго часткі, напрыклад спіну і ногі. Падчас працэдуры — ніякага болю, толькі рэлаксацыя і адчуванне прыемнага цяпла нейкі час пасля. Працэдура спрыяе стымуляцыі лімфаадтоку і ўмацаванню сасудаў, карэкцыі фігуры, у прыватнасці, яе лічаць эфектыўным сродкам у барацьбе з цэлюлітам і вялясцю скуры.

Яшчэ адна з навінак эстэтычнай медыцыны — карбаксітэрапія, або лячэнне медыцынскім вуглякіслым газам.

— Гэта ўнікальны спосаб палепшыць якасць скуры і авал твару. Таксама мае добры эфект для лячэння суставаў, пазваночніка, што выкарыстоўваецца, у прыватнасці, пры спінамазгавых грыжах, пятачнай шпоры, галаўных болях і іншых хваробах, — расказвае **ўрач агульнай практыкі санаторыя «Случ» Уладзімір ГУЗМАН.** — Працэдура цалкам бясшкодная. У любой тканцы нашага арганізма маецца вуглякіслы газ, мы толькі павялічваем яго канцэнтрацыю, уводзячы пад скуру. І атрымліваем рэакцыю ў адказ — у нас пашыраюцца крывяносныя, лімфатычныя сасуды, паскараецца і паляпшаецца абмен рэчываў. Гэта своеасаблівая зарадка для клетак. У выніку атрымліваем абязбольвальны і супрацьзапаленчы эфект. Да нас на гэту працэдуру (а курс у ідэале павінен складацца з 10 сеансаў), прыязджаюць нашы пастаянныя кліенты са Слуцка і Салігорска, тыя, хто адчуў станоўчы эфект, лечацца самі і рэкамендуюць знаёмым.

У хуткім часе з'явіцца яшчэ адна падобная працэдура — азонатэрапія. Унікальнай методыкай валодае і **ўрач-фізіятэрапеўт санаторыя Аляксандр БАРУШКА.** Метад спалучае лазератэрапію і лазерную рэфлексатэрапію.

— Гэта ўздзеянне на «кітайскія» кропкі па прынцыпе ігларэфлексатэрапіі, толькі без выкарыстання іголак, а з дапамогай магнітных імпульсаў — тлумачыць Аляксандр Сяргеевіч. — Таму гэта прыемная і камфортная працэдура, якая праходзіць пад рэлаксуючую музыку. Яна рэкамендуецца пры хваробах, якія дрэнна паддаюцца лячэнню традыцыйнымі метадамі, у прыватнасці пры бранхіяльнай астме, мігрэнях, заіканні, начным энурэзе, неўрозападобных ціках у дзяцей, астэахандрозе, радыкулітах. Гэта методыка апрабавана на працягу дзесяцігоддзяў. Мігрэнь, напрыклад, гэта спазма сасудаў, і зняць яе нават медыкаментозна вельмі складана. А гэты метад ліквідуе прычыну спазмы. Для дасягнення максімальнага эфекту патрабуецца тры курсы такіх працэдур на працягу года. А вось пры лячэнні начнога энурэзу значны эфект адчуваецца нават ад аднаго курса.

## Актыўны вольны час і здаровая дыета

— Наш санаторый дзеці выбіраюць у тым ліку з-за цёплай атмасферы і адносін выхавацеляў, педагогаў, медыкаў і іншых супрацоўнікаў, — упэўнена **намеснік загадчыка аддзела выхаваўчай і культурна-масавай работы санаторыя «Случ» Валянціна САЛАВЕЙ,** якая, дарэчы, працуе тут ужо 36 гадоў. — Ёсць дзеці, якія прыязджаюць да нас ужо 11-ы раз! Мы імкнёмся, каб яны не толькі аздаравіліся, але і актыўна і з карысцю правялі час. Штодзённа арганізуем інтэлектуальныя, пазнавальныя, забаўляльныя і фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы. Улічваем кола цікавасцяў дзяцей, пажаданні бацькоў. Кожнаму дзіцяці мы ствараем умовы для самарэалізацыі, а таксама стараемся даць душэўны спакой і камфорт. Напрыклад, у нас ёсць такая акцыя як «СМС любімай маме», дзе кожны піша добрыя словы і пажаданні. І мы заўсёды настройваем дзяцей, што ад нас яны павінны паехаць крыху больш добрымі і пяшчотнымі. Бацькі, дарэчы, нярэдка тэлефануюць нам з падзякамі.



Сярод шматлікіх узнагарод калектыву ёсць падзяка ад Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

У санаторыі маецца свая школа і ўсе неабходныя ўмовы для бесперапыннага адукацыйнага працэсу. Тут 13 абсталяваных вучэбных кабінетаў з тэхнічнымі сродкамі, нагляднымі дапаможнікамі, метадычнай літаратурай, тэлевізарамі, якія дазваляюць дэманстраваць вучэбныя фільмы. У кабінетах фізікі і хіміі, напрыклад, маецца ўсё неабходнае для правядзення вопытаў і выканання лабараторных работ.

У сталоўцы — толькі здаровае харчаванне.

— Пятніца ў нас — дзень беларускай кухні. Наша нацыянальная кухня прыдатная для прыгатавання дыетычных страў. Мы гатуем бульбяныя аладкі, дранікі, свініну па-дамашняму, кашы, — расказвае **загадчык харчаблока Лідзія ЗАМАРАЕВА.** — Афіцыянты ў гэты дзень надзяваюць нацыянальныя касцюмы, такім чынам дзеці далучаюцца да беларускіх традыцый.

Планы на будучае ў кіраўніцтва санаторыя самыя амбіцыйныя. Гэта і паляпшэнне жыллёвага фонду, матэрыяльна-тэхнічнай базы, пашырэнне спектру медыцынскіх паслуг і набыццё новага абсталявання.

— Не буду раскрываць усе планы, але скажу, што ў 2019 годзе санаторый «Случ» стане яшчэ больш сучасным і камфортным, — кажа Сяргей Марачкоўскі. — Запрашаю ўсіх ахвотных упэўніцца ў гэтым і адпачыць у нас.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Аксана МІСЕЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

***Супрацоўніца рэдакцыі газеты «Звязда» Аксана Міселя, якая адпачывала з дзецьмі ў санаторыі «Случ» у сакавіку, выказвае асаблівую падзяку за цёплы прыём кіраўніцтву і персаналу аздараўленчай установы.***



Для самых маленькіх адпачывальнікаў медыкі прапануюць спецыяльныя лячэбныя працэдуры.

# НЯБЕСНАЯ СЯМ'Я МАКАРАНКАЎ

## Чаму лётчыкі ядуць шмат шакаладу і ходзяць па зямлі з цацачнымі самалёцікамі

**«Першым чынам самалёты, а дзяўчаты — потым». Гэтыя словы з песні «Нябесны ціхаход» актуальныя для лётчыкаў дагэтуль. Пакуль мужы ў небе, жонкі завіхаюцца на зямлі, а пасля сужэнцы разам пачынаюць... тварыць. У прыватнасці, так адбываецца ў Яна і Валерыі Макаранкаў, якія па выніках конкурсу «Сям'я — крышталь грамадства» сталі найлепшай маладой сям'ёй 116-й штурмавой авіяцыйнай базы ў Лідзе. Абодва яны спяваюць, пішуць вершы пра сваю сям'ю і іграюць на музычных інструментах.**

### Паветраны шар і тройка коней

Валерыя заўжды марыла атрымаць прапанову рукі і сэрца на паветраным шары, каб вакол было цёпла, прыгожа, а ўдалечыні ружавеў захад... У рэальнасці гэта здарылася ўзімку на вяршыні гары, калі надвор'е было марозна-ветранае. Зразумела, гэта зусім не сапсавала ні мары пра шчаслівае жыццё, ні яго далейшы ход. Сваю гісторыю маладыя ўспамінаюць з цеплынёй і натхненнем.

Ян і Валерыя пазнаёміліся ў 2013-м на парадзе з нагоды 70-годдзя Перамогі. Ян, тады яшчэ курсант другога курса, стаяў у ачапленні і знайшоў Валерыю вачыма ў натоўпе людзей. Пасля мерапрыемства яны сустрэліся.

— Калі двое хочуць знайсці адно аднаго, гэта не праблема, нават калі будзе процьма людзей, — кажа хлопец.

— Мне падабаюцца мужчыны ў форме, падабаецца, як яны выглядаюць, як даглядаюць сябе. Ну як не пагледзець на такога прыгажуна? — смяецца Валерыя. — А калі пачалі размаўляць, зразумела, што гэта вельмі душэўны і блізкі па светапоглядзе чалавек.

Прапанову Ян зрабіў Валерыі падчас адпачынку ў Карпатах. Дзяўчына чакала, пакуль каханы накатаецца на лыжах, бо, як яна прызнаецца, у самой яе з лыжамі не вельмі заладзілася. Нарэшце перад замёрзлай сяброўкай з'явіўся Ян, і яна ўзрадавана рушыла да фунікулёра. Але хлопец нагадаў: «Дык мы ж хацелі на санках з коньмі праехацца, памятаеш?»

— Што было рабіць? Раз ён так сказаў, прыйшлося пагадзіцца, — успамінае Валерыя. — І вось мы імчым на самы верх гары. Я ў трымценні ўся, аднак раблю выгляд, што любуюся наваколлем. Тут ён прапаноўвае мне зрабіць пару здымкаў гэтай прыгажосці. Я, хоць ледзьве трымаю апарат ледзянымі пальцамі, паслухмяна фатаграфую. Паварочваюся і бачу свайго каханага на калене. Вядома, я адказала «так».

Ян кажа, што прапанова на паветраным шары не была б для будучай жонкі нечаканасцю, а яму хацелася менавіта такога эфекту.

Ажаніліся пара крыху менш як год таму і сёлета сімвалічна будзе адзначаць першую гадавіну сямейнага жыцця, 5-годдзе з дня сустрэчы і 75-годдзе Перамогі. Тлумачаць, што так доўга сустракаліся, бо ставіліся сур'ёзна да стварэння сям'і.

— Пакуль вучыўся, разумеў, што жаніцьба нічога не зменіць, — успамінае Ян. — Пасля выпуску я стаў паўнапраўным афіцэрам і мне ўжо было куды прывесці жонку. Тым больш што я хацеў зрабіць прапанову рукі і сэрца рамантычна, вось і чакаў, пакуль закончу акадэмію.



### Самалёты ў інтэр'еры і жыцці

Ян — былы мінчанін. Валерыя — родам з Сібіры. Яе дзядуля ў свой час паехаў з Беларусі ў Расію будаваць горад Лангепас, што ў Цюменскай вобласці. А дзяўчына, якая па спецыяльнасці архітэктар, вярнулася адтуль у Беларусь, каб будаваць дамы ў Мінску. Так атрымаўся своеасаблівы кругазварот. **Валерыя МАКАРАНКА, тэхнік-праекціроўшчык праектнай майстэрні «Інстытут Гроднагramadзянпраект»**, працягвае павышаць сваю адукацыю і завочна вучыцца ў БНТУ на інжынера-будаўніка:

— Мінск даў мне цудоўны вопыт па прыватным домабудаўніцтве, у тым ліку па праектаванні павільёнаў, перапланіроўцы кватэр, і не толькі ў сталіцы, а па ўсёй краіне. Цяпер распрацоўваю генеральныя планы пад шматпавярховае будаўніцтва. І гэта прыемна — усведамляць, што ты прадумваеш, як зрабіць найбольш камфортнымі кватэры для людзей, у тым ліку і ваенных.

116-я штурмавая авіяцыйная база ў Лідзе стала для **Яна МАКАРАНКІ, намесніка камандзіра авіяцыйнага звяна вучэбна-трэніровачнай эскадрыллі**, першым месцам працы. Маладая адразу ацаніла гэтую ціхую мясціну і старанна вывучаюць яе краявіды падчас прагулак з сабакам.

— Цяпер я адчуваю сябе больш спакойна, чым у Мінску. Няма такога, што пераехалі з вялікага горада ў маленькі і жыццё на гэтым спынілася, — кажа Валерыя. — Хоць мы вельмі любім ездзіць па ўсёй Беларусі, але Ліда стала месцам, дзе хочам уладкоўваць сваю будучыню.

Макаранкі жывуць у службовай кватэры, аднак наводзяць у ёй парадак, як ва ўласным сямейным гняздзе. Сцены дэкарываюць карцінамі з самалётамі і рукадзельнымі работамі Валерыі, якія яна дарыла будучаму мужу падчас яго вучобы. У цэнтры пакоя размясціўся «лавец сноў», якога маладыя прывезлі з вясельнага падарожжа. Усе сувеніры яны стараюцца падбіраць так, каб іх можна было выкарыстаць у інтэр'еры.

А яшчэ дзяўчыне падабаюцца самаробныя брошкі. У дзень нашай сустрэчы да яе блузкі быў прыколаты паветраны шар.

— Калі жывеш з мужам-лётчыкам, паступова прывязваешся да авіяцыі, — смяецца Ян. — То бірулька-самалёцік, то значок на рукзак, і так плаўна ў авіяцыю ўлівацца пачынаеш.

Валерыя, дарэчы, на сабе паспытала адчуванні мужа. Калі Ян вучыўся на другім курсе, ён адвёў дзяўчыну ў аэраклуб. Там інструктар «пакатаў» яе ў небе, «выпісаўшы» на самалёце ўсе магчымыя фігуры.

— Ян не вельмі любіць дзяліцца тым, чым ён займаецца на рабоце. Але пасля таго палёту я пачала разумець, наколькі гэта складаная работа і не кожны зможа яе зрабіць. Пачала ставіцца да яго з большым разуменнем, тым больш што абстаноўка дома напрамую ўплывае на яго стан у кабіне, — дзеліцца яна.



### У небе няма выпадковых

— Конкурс «Сям'я — крышталь грамадства» праводзіцца ва Узброеных Сілах краіны, каб фарміраваць станоўчы вобраз ваеннаслужачых. Тут яны паказваюць свае найлепшыя якасці і раскрываюць таленты, — далучаецца да размовы **намеснік камандзіра вучэбна-трэніровачнай авіяцыйнай эскадрыллі Эдуард ЖМАКІН**.

Пры гэтым спаборніцтвы праходзяць вельмі ярка і творча, прымушаць да ўдзелу нікога не трэба. Удзельнічаць Макаранкі хацелі яшчэ летась, аднак не атрымалася. Сёлета жаданне рэалізавалася. Яны з імпэтам рыхтаваліся да спаборніцтваў: пісалі вершы, песні, рабілі прэзентацыі...

Наперадзе наступны этап — спаборніцтва з іншымі найлепшымі парамі ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны. А пасля — конкурс Міністэрства абароны, дзе за званне найлепшай пары змагаюцца маладыя сем'і з воінскіх часцей усёй краіны. «І мы настроены на перамогу», — у адзін голас кажуць Ян і Валерыя.

— Я вельмі задаволена, што магу дапамагчы мужу ў такіх конкурсах і рэалізаваць свой творчы патэнцыял, і мы здольныя разам зрабіць шмат прыгожага і дзіўнага, — дзеліцца Валерыя. — Пакуль складалі вершы, шмат новых якасцяў у сабе адкрылі.

— У наступным туры мы спадзяёмся так прадставіць нашу базу, каб людзям стала цікава даведацца пра яе больш і, магчыма, прыйсці сюды служыць, — мяркуе Ян.

Ён — першы ваенны ў сваёй сям'і. Прычым пайсці ў Ваенную акадэмію вырашыў толькі ў дзясятым класе. А яшчэ заўжды хацеў скокнуць з парашутам. Гэта вырашыла справу. Лятаць курсанты пачалі з першых курсаў — на планёры. На апошніх Ян ужо лунаў у небе над Лідай.

— Як толькі сеў упершыню за штурвал — зразумеў, што не памыліўся з выбарам, гэта маё, — кажа ён.

— У авіяцыі ўвогуле не бывае выпадковых людзей, — дадае Эдуард Жмакін. — Часам прыходзіцца ахвяраваць нейкімі момантамі прыватнага жыцця дзеля неба, таму чужыя тут не затрымліваюцца. Прафесія ваеннага пераносіцца і ў штодзённы быт сям'і. Жонкі нашых лётчыкаў, напрыклад, адрозніваюць самалёты па гуку, не гледзячы ў неба. Нават шпалеры ў некаторых у «самалёціках».

### Не менш, чым трое

Лідскаму аэрадрому больш за 100 гадоў. За гэты час тут склаліся свае традыцыі, наладзілася пераемнасць пакаленняў. Многія рэчы застаюцца нязменнымі. Напрыклад, праз празмерныя нагрузкі лётчыкам патрэбна шмат вугляводаў і вітамінаў. А іх найбольш у шакаладзе і згушчоным малацэ, таму гэтыя прадукты ў іх пайку абавязковыя. «Здаровы сон і харчаванне — залог паспяховага лятання». Насамрэч гэтыя жартаўлівыя словы — чыстая праўда. Такі рэжым лётчыкам неабходна вытрымліваць для якаснай работы.

— Лётчык павінен быць у добрай форме, каб выконваць фігуры вышэйшага пілатажу, манеўраваць падчас баявых дзеянняў, вытрымліваць перагрузкі і іншае. У лётчыкі ідуць найлепшыя з найлепшых, бо многіх адсейваюць па медыцынскіх паказчыках. Мы не маем права памыліцца, таму што гэта не толькі наша жыццё, а і навакольных, плюс дарагое абсталяванне, — расказвае Эдуард Жмакін і паказвае сімулятар палётаў ЯК-130, на якім лётчыкі адпрацоўваюць разнастайныя сітуацыі.

Сядаючы ў кабіну, трапляеш у трохмерную прастору і адчуваеш, як уздымаецца самалёт, як перваарочваецца ў небе, як саджаеш яго. Нават проста назіраючы, як зямля з небам перакульваюцца, мяняючыся месцамі, я адчула, як зашумела ў галаве. Што ўжо казаць пра сапраўдную вышыню...

А яшчэ траекторыю палёту адпрацоўваюць на зямлі — «пешым па лётнаму», як кажуць тут. Незалежна ад звання бярэш мадэль самалёта ў руку і «ляціш» з ім па зададзенай траекторыі, ідучы па зямлі.

У найбліжэйшых планах сям'і Макаранкаў, акрамя перамогі ў конкурсе Міністэрства абароны, — цвёрда ўстаць на ногі, набыць аўтамабіль. А далей ажыццявіць мару пра траіх дзетак. Ян кажа, што зробіць усё магчымае, каб іх будучы сын пайшоў па слядах бацькі. А Валерыя дадае: «Галоўнае, каб ён стаў такі ж шчаслівы, як мы. Абстаўляючы кватэру, я ўжо пацiху думаю, дзе паставіць ложачак».

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**



Мама, пачытай!

# Тайны госць

Наверсе шафы, у антрэсолі, нешта зашамацела.

«Мыш, — падумала я, але тут жа засумнявалася: — Мышэй у нас не магло быць. Яны ж не сябруюць з нашым Мурзікам».

Не паспела так падумаць, як дзіўны гук паўтарыўся.

Хто ж гэта можа быць?

Я хацела ўзяць табурэт, падставіць яго бліжэй да шафы, адкрыць дзверцы антрэсолі і зазірнуць туды. Пэўна, я так і зрабіла б, але ў гэты момант у мой пакой забегла Маша.

— А нам мама сёння яблычны пірог пякла! Смаката якая! Я табе прынесла пакаштаваць! — Маша паставіла талерку з кавалкам пірага на стол і дадала: — Нясі гарбату, будзем піраваць!

Я прыклала ўказальны палец да вуснаў і прашаптала:

— Ціха! — І паказала на антрэсоль: — Там хтосьці ёсць!

Маша прысела на канапу і зацікаўлена зірнула ўверх:

— Хто?!

— Каб я ведала! Дакладна не мышы, бо яны не сябруюць з Мурзікам.

— А я ведаю! — усміхнулася Маша. — Гэта іншапланетны госць. Я ўчора вечарам разам з татам глядзела навуковую перадачу пра іх. Часам здараецца так, што іншапланецяне могуць збіцца з курсу і да каго-небудзь заблукаць. Нават ёсць сведкі.

— Іншапланецянін? — здзівілася я і таксама прысела на канапу. — Неяк я пра гэта не падумала. — І пра што мы будзем з ім гаварыць? І ці зразумее ён нас?

— Зразумее, — сказала Маша. — У іх да вуха прыстасаваны такі прыборчык, які перакладае на іх мову ўсе мовы свету!

— Тады трэба падрыхтаваць пытанні, якія мы яму зададзім, — вырашыла я.

— Я запытаюся, ці ёсць на іх планеце марожанае і шакаладкі і колькі гэтыя прысмакі ў іх каштуюць. Калі бясплатна ці танна, я палячу з ім. Хоць тыдзень паем прысмакаў удосталь.

— А я запытаюся, ці ёсць на іх планеце школа і дамашнія заданні. Калі няма, то таксама палячу на яго планету.

— А як мы ўсе памесцімся ў лятучай талерцы? — запыталася Маша.

Тут ужо прыйшлося мне падключачыць сваю эрудыцыю:

— Талерка набывае форму тых, хто ў ёй знаходзіцца!

— А ты не будзеш сумаваць па родных, сябрах, школе?

— Ну, мы толькі на тыдзень. А там, на іншай планеце, ён праходзіць вельмі хутка. Ніхто і не заўважыць нашай адсутнасці, — запэўніла я сяброўку.

— Тады давай ужо адчынім дзверцы антрэсолі і зірнём на яго — іншапланетнага госця, — прапанавала Маша.

Я ўзяла табурэт і паставіла яго ля шафы. Не паспела ўзлезці на яго, як дзверцы антрэсолі расчыніліся і з яе паказалася пухнатая галава... Мурзіка! Дык вось хто ўвесь гэты час палохаў мяне! Мурзік скокнуў на падлогу.

— І калі ты толькі забраўся туды? — запыталася я ў ката.

На гэта, вядома, Мурзік нічога не адказаў.

Мы з Машай селі за стол, сталі піць гарбату з яблычным пірагом і абмяркоўваць тэлеграму пра іншапланецян. Так хацелася, каб адной госць з іншай планеты ўсё ж завітаў да нас у госці. Такі пірог, які пячэ Машына мама, павінен паспытаць кожны!

**Андрэй СІДАРЭЙКА.**

Нататкі шматдзетнага таткі



# КОЖНЫ З НАС — КРАІНА

Размова двайнятак.

Вера:

— Напэўна, вельмі страшна працаваць сцюардэсай...

Поля:

— А што там страшнага? Два разы прайшоў па самалёце, а астатні час сядзіш прышпілены.

Вера абурана:

— Поля, якая розніца, калі самалёт упадзе?!

Думаў, спрэчка скончана на карысць Веры, але дзе там.

Поля:

— Тады навошта, па-твойму, у самалёце прышпільваюцца?

Вера не знайшла, што адказаць, і прыйшлося ўжо мне тлумачыць, што падаць прыемней прышпіленым.

***P.S.** Хоць, безумоўна, я магу памыляцца.*

* * *

А вось зараз я злёгку афігеў.

Сын:

— Тата, напішы мне заяву ў школу.

— Якую яшчэ заяву?

— Што я заўтра не пайду на апошні ўрок.

— А чаму гэта ты заўтра не пойдзеш на апошні ўрок?

— Таму што заўтра апошні дзень вучобы перад канікуламі.

— А проста не пайсці на апошні ўрок ты не можаш?

— Магу. Але лепей, калі будзе заява.

Нахабнасць — другое шчасце (а ў гэтым выпадку нават першае). Але я напісаў, канешне. Усё-такі з заявай сачкаваць урок больш прыемна, тут яго праўда.

***P.S.** І як гэта я ў дзяцінстве да гэтага не дадумаўся?*

* * *

Паказаў сыну артыкул, у якім гаворыцца, што на 97,5 % людзей смартфон аказвае згубнае ўздзеянне. Ён прачытаў, паглядзеў на мяне і сказаў:

— Не турбуйся, тата, на шчасце я належу да тых іншых 2,5 %.

Ну што ты будзеш з ім рабіць?

* * *

Сын:

— Калі ўявіць, што кожны з нас гэта якая-небудзь краіна, то Марта — гэта Расія.

— Чаму?

— Таму што яна пастаянна да ўсіх чапляецца.

— А астатнія хто?

— Мама — гэта Амерыка: яна ўсіх вучыць жыць. Я — гэта Аўстралія: у мяне свой пакой і мне ўсё да лямпачкі. Двайняты — гэта Беларусь і Украіна: быццам бы сябруюць, але кожная сама сябе наўме.

— А я тады хто?

— А ты, тата, — гэта Швейцарыя.

— Чаму Швейцарыя?

— Ну, па-першае, ты кантралюеш нашы фінансы. Па-другое, ва ўсіх канфліктах ты захоўваеш нейтралітэт. А па-трэцяе, у цябе шмат гадзіннікаў.

Потым сталі разам думаць, якую краіну прадстаўляе Ксенія. Вырашылі, што Ксенія гэта... Паўночная Карэя: любіць гучна заяўляць аб сабе і ўвесь час патрабуе, каб яе кармілі.

Пасля гэтай незвычайнай размовы мне быццам бы стала многае зразумела, прычым не толькі ў жыцці нашай раіны, але і ў вялікай палітыцы наогул. Калі, напрыклад, Марта сварыцца з мамай — значыць, зноў Расія з Амерыкай нешта не падзялілі.

А калі па тэлевізары Паўночная Карэя пагражае ўсяму свету, значыць, гэта проста Ксенія спрабуе звярнуць на сябе ўвагу.

***P.S.** І толькі пра Швейцарыю амаль нічога не чуваць — на тое яна і Швейцарыя.*

**Павел ХОЛАД.**

## ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СУСТРАКАЕМ ВЯЛІКДЗЕНЬ

### КУЛІЧ «КРАФІН»

Сумесь далікатнага кекса і слоенага круасана, прыгатаваная ў велікодным стылі



***Спатрэбіцца:*** *пшанічная мука — 350 г, малако —100 мл, жаўток — 2 шт,, яйка — 1 шт., масла — 40 г (для цеста) і 100 г (для змазвання пластоў), міндальныя пялёсткі — 100 г, цукар — 80 г, соль — 0,5 ч. л., мускатны арэх — 1 ч. л., дрожджы — 20 г свежых або 7 г сухіх, сушаныя журавіны (можна выкарыстоўваць разынкі або іншыя сухафрукты) — 200 г, ванільны цукар — 10 г.*

Змяшаць дрожджы з 1 ч. л. цукру і заліць цёплым малаком. Змясціць сумесь у цёплае месца, чакаць, пакуль над ёй не паднімецца пенная шапачка.

Растапіць у каструльцы масла. У глыбокай пасудзіне ўзбіць жаўткі з яйкам і ванільным цукрам. Узбіваць неабходна да ўтварэння пышнай пены.

Прасеяць у глыбокую міску муку, а ў цэнтры зрабіць невялікае паглыбленне. Наліць у яго дрожджы, якія падняліся, дадаць яечную сумесь, частку масла і соль. Усе інгрэдыенты старанна перамяшаць, дадаць масла, якое засталося, і замясіць цеста. Мясіць трэба да таго часу, пакуль цеста не перастане ліпнуць да пальцаў.

Пакласці гатовае цеста ў глыбокі посуд, змазаны маслам. Злёгку памазаць паверхню маслам, накрыць харчовай плёнкай і адправіць у цёплае месца, каб цеста для будучых куліочоў паднялося.

Калі цеста паднімецца, раздзяліць яго на тры роўныя часткі, скруціць з кожнай шар і ахінуць плёнкай яшчэ на 10 хвілін.

Прысыпаць мукой рабочую паверхню, раскачаць адну частку цеста ў тонкі прамавугольны пласт. Цеста павінна быць напаўпразрыстым, але трэба сачыць, каб яно не парвалася. Змазаць цеста размякчаным маслам.

Раўнамерна размеркаваць па паверхні мускатны арэх, журавіны і міндальныя пялёсткі. Можаце выкарыстаць любыя іншыя сухафрукты і цукаты.

Акуратна згарнуць цеста ў рулет. Тое ж самае зрабіць з астатнімі часткамі цеста.





У выніку павінны атрымацца тры святочныя кулічы!

Вострым нажом разрэзаць рулет уздоўж, не даразаючы некалькі сантыметраў да краю.

Палову рулета скруціць у спіраль, тое ж самае зрабіць з другой паловай, але змясціць яе па-над першай. Зрабіць так з кожным рулетам.

Змясціць кулічы ў формы для выпякання і пакінуць на 20 хвілін у цёплым месцы.

Калі цеста злёгку паднімецца, адправіць велікодныя «Крафіны» на 10 хвілін у духоўку, разагрэтую да 200 °С, затым паменшыць тэмпературу да 180 °С, накрыць кулічы фольгай і выпякаць яшчэ 10 хвілін. Пасля гэтага фольгу зняць і выпякаць кулічы яшчэ 15 хвілін.

Прысыпаць гатовую выпечку цукровай пудрай.

САВА НЕ РОДЗІЦЬ САКАЛА (Беларуская народная прымаўка)

# КАШТОЎНАСЦІ ПАД ПАГРОЗАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спачатку крыху гісторыі. У гісторыка-краязнаўчым выданні «Наш край Магілёўскі» гісторыка і пісьменніка Мікалая Барысенкі ёсць падрабязнае апісанне гэтай славутасці. Княжыцкі касцёл з'яўляецца помнікам архітэктуры барока, ён быў пабудаваны ў 1681 годзе ўладальнікам мястэчка надворным харунжым Вялікага Княства Літоўскага Канстанцінам Пацам і першапачаткова быў драўляным. А каменным ён стаў ужо ў XVIII стагоддзі. За сваё жыццё будынак пабываў і каталіцкім, і праваслаўным. Даследчыкі звяртаюць увагу і на тое, што ён мае асаблівасці ўніяцкіх цэркваў тых часоў. Велічная пабудова з пілястрамі і арачнымі праёмамі выглядае самавіта і відаць з дарогі яшчэ за некалькі кіламетраў. На жаль, стан яе не радуе.

— Зараз там небяспечна знаходзіцца нават побач, вельмі вялікая імавернасць абрушэння. Касцёл трэба як мага хутчэй ратаваць, — перасцерагае Мікалай Барысенка. — Перш за ўсё трэба яго максімальна закансерваваць. Зрабіць дах, закрыць вокны, каб вільгаць не трапляла ўнутр. Такі помнік, як княжыцкі касцёл, павінен быць захаваны. Ён цікавы і як экскурсійны аб'ект, і як гісторыка-культурная спадчына.

У адказе заяўніку з Магілёўскага аблвыканкама гаворыцца пра тое, што княжыцкі касцёл Святога Мікалая ўключаны ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў нашай краіны і мае другую катэгорыю каштоўнасці. У 2015 годзе ў адпаведнасці з дзяржпраграмай «Культура Беларусі» была распрацаваная праектна-каштарысная дакументацыя для правядзення супрацьаварыйных работ па кансервацыі, а таксама выкананы праект зоны аховы. Аб'ект быў уключаны ў спіс мерапрыемстваў па рэалізацыі праграмы на 2016—2020 гады для правядзення аднаўленчых работ. Патрэбна 370 тысяч рублёў, але такіх сродкаў ні ў раённым, ні ў абласным бюджэтах на гэтыя мэты сёння няма. Аблвыканкам даручыў Магілёўскаму райвыканкаму разгледзець магчымасць кансервацыі аб'екта з прыцягненнем сродкаў з фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, а таксама актывізаваць работу па прыцягненні пазабюджэтных сродкаў.

Цяпер што датычыцца гістарычных будынкаў па вуліцы Лазарэнкі, былой Віленскай, пад нумарамі №№ 7, 13, 15. Яны з'яўляюцца часткай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гістарычны цэнтр Магілёва: будынкі і збудаванні...» і ўключаны ў дзяржаўны спіс.

Уласнікам будынка № 7 сёння з'яўляецца рэлігійная арганізацыя хрысціян веры евангельскай. Летась арганізацыі быў дадзены дазвол Міністэрства культуры, а таксама Магілёўскага гарвыканкама на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ па рэканструкцыі аб'екта і добраўпарадкаванні тэрыторыі. За неналежнае ўтрыманне аб'екта ўласнік ужо двойчы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. У цяперашні час будынак зацягнуты будаўнічай сеткай, вывезена смецце і прыбрана пустазелле.



Калі не захаваць гэтыя будынкі, стары Магілёў хутка знікне.

Фота Алега ДЗЬЯЧКОВА.

Уласнікам будынка № 13 з'яўляецца будаўнічае прадпрыемства «ЭмВікПрафБуд». Будынак абнесены сеткай і агароджаны з унутранага боку. Зараз, па інфармацыі аблвыканкама, распрацоўваецца праектная дакументацыя.

А будынак № 15 у будучыні павінен стаць шматкватэрным жылым домам з адміністрацыйнымі памяшканнямі. Магілёўскі гарвыканкам дазволіў яго ўласніку ТАА «Вінэртрэйд» праводзіць праектна-пошуковыя работы і будаўніцтва. Пытанне захаванасці гэтых помнікаў гістарычна-культурнай спадчыны знаходзіцца на кантролі гарвыканкама.

Дарэчы, усе гэтыя будынкі адносяцца да XIX—XX стагоддзяў, яны будаваліся як даходныя дамы. На першых паверхах былі невялікія крамы, а на верхніх — жылыя памяшканні.

— Такіх будынкаў у Магілёве засталося зусім мала. Калі іх не захаваць, мы цалкам страцім стары горад, — звяртае ўвагу Мікалай Барысенка. — Трэба арганізаваць якасны нагляд за выкананнем работ на гэтых аб'ектах. Яны ні ў якім разе не павінны ператварыцца ў руіны.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Новае жыццё памятных мясцін

Малая радзіма



Адрэстаўраваны палац Пуслоўскіх у Косаве.

**Сёння ўжо традыцыйна ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін. У Беларусі да гэтай даты быў прымеркаваны Фэст экскурсаводаў, які з размахам прайшоў па ўсёй краіне, прыцягнуўшы многім невядомыя раней старонкі гісторыі сваёй малой радзімы. Таксама ў гэты час прынята падводзіць вынікі таго, што было зроблена ў справе аховы і захавання помнікаў у мінулым годзе. Такімі звесткамі з карэспандэнтам «Звязды» падзялілася намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Беларусі Наталля ХВІР.**

— У 2018 годзе на 115 гісторыка-культурных каштоўнасцях завершаны рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Сярод такіх аб'ектаў будынак музея Бяльніцкага-Бірулі ў Магілёве, Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне, стадыён «Дынама», помнік гісторыі «Трасцянец» у горадзе Мінску, таксама 16 аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці ў ходзе падрыхтоўкі да святкавання 1000-годдзя горада, — распавядае Наталля Хвір. — За кошт сродкаў фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва праводзіліся работы па кансервацыі і рэстаўрацыі фрагментаў замка ў Крэве, кансервацыя з фрагментарнай рэстаўрацыяй руін былога замка Сапегаў у Гальшанах, рэстаўрацыйныя работы ў палацава-паркавым ансамблі Пуслоўскіх у Косаве Івацэвіцкага раёна. Выконваліся работы па рэканструкцыі былога паркавага палаца Сапегаў у Ружанах Пружанскага раёна, а таксама Старога замка ў Гродне.

Спецыяліст адзначае, што для гэтых мэт выкарыстоўваліся не толькі сродкі рэспубліканскага бюджэту — вялася пастаянная работа за кошт мясцовых бюджэтаў, праграм трансгранічнага супрацоўніцтва, праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Варта адзначыць, што на сённяшні дзень у дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў уключана 5573 аб'екты. З іх помнікаў гісторыі мемарыяльнай тэматыкі — абеліскі, пахаванні, брацкія магілы, магілкі — 1211.

Наталля Хвір дадае: «Арганізавана работа па пашырэнні прысутнасці беларускіх аб'ектаў у спісе спадчыны ЮНЕСКА. Яе вынікам стала ўключэнне ў сусветны спіс нематэрыяльных каштоўнасцяў Будслаўскага фэсту. Для транснацыянальнай намінацыі гэтага ж спіса сумесна з польскім бокам падрыхтаваны і накіраваны ў Парыж звесткі пра лясное бортніцтва Беларусі і Польшчы».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 30.04.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 80 %)**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4290 – здание заправочной станции,** площадь – 6,7 кв. м, составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание заправочной станции с ограждением, воротами, адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А/1. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4291– здание гаража,** площадь – 451,0 кв. м, адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4292 – проходная,** площадь – 7,0 кв. м, составные части и принадлежности: Здание проходной с отмосткой, дворовое покрытие, бортовой камень, ворота с калиткой, три ограждения; адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А. **Капитальное строение, с инв. № 722/С-4293 – здание склада**, площадь – 32,0 кв. м; адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А/2. **Электрические сети инв. №68001,** тип кабеля АВВГ 3х25+1х16 кв. мм, протяженность – 200 м. **Сведения о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 724255100001001524, площадь – 0,6518 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственных зданий, расположен по адресу: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А, предоставленном на праве постоянного пользования.

**Начальная цена продажи: 17 737,52 бел. руб. с учетом НДС (20 %).**
**Сумма задатка: 1 773,75 бел. руб.**

**Аукцион состоится 30 апреля 2019 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: 29 апреля 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Продавец**: ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а, тел. 73-57-84

**Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП«Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 7 % от конечной цены реализации, включающее в т. ч. и затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 31.01.19, 12.03.2019 и 30.03.2019

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, Mogilev@ino.by**


БТА БАНК

## Бухгалтерский баланс на 1 апреля 2019 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 8 005 | 5 689 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 14 919 | 13 488 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 8 318 | 6 536 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 31 478 | 32 890 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 145 159 | 136 048 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 9 505 | 9 570 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 799 | 802 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 844 | 1 096 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **219 027** | **206 119** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 24 966 | 32 929 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 127 507 | 105 172 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 19 037 | 20 820 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 548 | 497 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **172 058** | **159 418** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 307 | 1 246 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 8 214 | 8 209 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 701 | 12 499 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **46 969** | **46 701** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **219 027** | **206 119** |

## Отчет о прибылях и убытках на 1 апреля 2019 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2019 | 01.04.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 3 376 | 2 540 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 058 | 1 036 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 318 | 1 504 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 633 | 893 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 93 | 81 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 540 | 812 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (72) | (31) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 353 | 400 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 10 | 8 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (92) | 5 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 44 | 50 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 2 802 | 2 477 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 108 | 75 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 375 | 186 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 112 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 263 | 186 |

Председатель Правления А.В. Доронкевич

Главный бухгалтер Т.Н. Ковалева

Дата подписания: 3 апреля 2019 г.

ЗАО «БТА Банк» Лицензия НБ РБ № 17 от 28.05.2013 г. УНП 807000071

**Смолевичский районный исполнительный комитет вносит изменения в информационное сообщение, опубликованное в газете «Звязда» от 02.04.2019 г., изложив пункт 7 в новой редакции:**

| | | |
|---|---|---|
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 20 000 рублей<br>Лот № 2 – 20 000 рублей<br>Лот № 3 – 20 000 рублей<br>Лот № 4 – 20 000 рублей<br>Лот № 5 – 20 000 рублей<br>Лот № 6 – 30 000 рублей<br>Лот № 7 – 30 000 рублей<br>Лот № 8 – 30 000 рублей<br>Лот № 9 – 30 000 рублей<br>Лот № 10 – 20 000 рублей |

УНП 600014139

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года имущества, принадлежащегоУП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», расположенного по адресу: г. Барановичи, ул. Фроленкова, 13

Право заключения договоров аренды помещений в здании вокзала «Барановичи-Полесские» с инв. № 110/С-72258:
Лот № 1. Площадь 14,6 кв. м. Начальная цена, с НДС – 61,69 бел. руб. Задаток – 6,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 10,95 базовой арендной величины.
Лот № 2. Площадь 14,5 кв. м. Начальная цена, с НДС – 61,26 бел. руб. Задаток – 6,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 10,88 базовой арендной величины.
Лот № 3. Площадь 14,6 кв. м. Начальная цена, с НДС – 61,69 бел. руб. Задаток – 6,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 10,95 базовой арендной величины.
Лот № 4. Площадь 187,4 кв. м. Начальная цена, с НДС – 791,77 бел. руб. Задаток – 79,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 140,55 базовой арендной величины.
Лот № 5. Площадь 29,2 кв. м. Начальная цена, с НДС – 123,37 бел. руб. Задаток – 12,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 21,9 базовой арендной величины.
Лот № 6. Площадь 29,3 кв. м. Начальная цена, с НДС – 123,79 бел. руб. Задаток – 12,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 21,98 базовой арендной величины.
Лот № 7. Площадь 67,8 кв. м. Начальная цена, с НДС – 286,46 бел. руб. Задаток – 28,00 бел. руб. Размер ежемесячной арендной платы: 50,85 базовой арендной величины.

**Условия аукциона:** 1. Заключить с Продавцом договор аренды Объекта (Объектов) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость, приобретенного на аукционе лота (лотов) в течение 1 (одного) банковского дня со дня подписания договора аренды. 3. В договорах аренды будут предусмотрены следующие условия: расчеты за энергоносители по предоплате; оплата услуги по передаче электроэнергии, технологического расхода электрической энергии на ее транспортировку по электрическим сетям в соответствии с расчетом, компенсация расходов на выполнение расчета технологического расхода. В договорах аренды одним из условий расторжения договоров по требованию арендодателя – производственная необходимость. 4. Оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 5. Целевое назначение Лотов №№ 1–3, № 5, № 6 – для организации розничной торговли; Лота № 4 – для организации общественного питания и розничной торговли; Лота № 7 – для организации работы общественного туалета.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Базовая арендная величина с 01.04.2019 равна 16 руб. 90 коп.

Цена продажи Лота (Лотов) не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 составляет 1 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 20.05.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона: 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Станция Барановичи-Центральные, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5б, тел. 8 (0163) 49-56-96. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 9.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота №__, проводимом 20.05.2019 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 16.05.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объектов – Заводцов Николай Иванович, тел. 8 (033) 674-87-91

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

БЕЛЭКСИМГАРАНТ
EXIMGARANT OF BELARUS

**Годовая бухгалтерская отчетность Белорусского республиканского унитарного предприятия экспортно-импортного страхования «Белэксимгарант» за 2018 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 января 2019 года

| | |
|---|---|
| Страховая организация | **БРУПЭИС «Белэксимгарант»** |
| Учетный номер плательщика | **101421509** |
| Вид экономической деятельности | **65120** |
| Организационно-правовая форма | **1310** |
| Орган управления | **3110** |
| Единица измерения | **руб.** |
| Адрес | **Минск, ул. Мельникайте, 2, пом. 1** |

| АКТИВЫ | Код строки | На 1 января 2019 года | На 31 декабря 2017 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 7 307 997 | 7 151 715 |
| Нематериальные активы | 120 | 123 570 | 92 529 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 24 986 | 26 161 |
| В том числе | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | 24 986 | 26 161 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 175 503 | 126 067 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 379 753 187 | 379 753 187 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | 65 180 185 | 47 352 790 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 77 | 666 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **452 565 505** | **434 503 115** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 758 307 | 707 845 |
| В том числе | | | |
| материалы | 211 | 758 307 | 707 845 |
| незавершенное производство | 212 | - | - |
| прочие запасы | 213 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 220 | 51 022 | 68 261 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | - | - |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | 67 307 097 | 48 208 726 |
| В том числе | | | |
| резерв незаработанной премии | 241 | 61 089 483 | 44 073 653 |
| резервы убытков | 242 | 6 217 614 | 4 135 073 |
| другие технические резервы | 243 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 43 558 455 | 33 663 138 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 150 000 | 150 000 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 116 636 475 | 110 732 384 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **228 461 356** | **193 530 354** |
| **БАЛАНС** | **300** | **681 026 861** | **628 033 469** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 1 января 2019 года | На 31 декабря 2017 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 435 000 000 | 427 000 000 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 174 000 | 154 000 |
| В том числе резервный фонд заработной платы | 441 | 174 000 | 154 000 |
| Добавочный капитал | 450 | 2 338 976 | 2 360 222 |
| В том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 17 371 071 | 19 231 571 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **454 884 047** | **448 745 793** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | - | - |
| Резерв незаработанной премии | 501 | 140 157 838 | 113 894 569 |
| Резервы убытков | 502 | 25 033 238 | 22 560 738 |
